PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 48 (2481) Год XLVIII | Беласток, 30 лістапада 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Занатоўкі з маёй рэзервацыі

Памяць народа таксама ў трагічным мінулым

Яўген Вапа

Цягам апошніх тыдняў здарыліся на Беласточчыне вельмі важныя для нашай самасвядомасці падзеі. Напачатак па першай праграме польскага тэлебачання дэманстраваўся дакументальны фільм Агнешкі Арнольд „Герой" пра Рамуальда Райса „Бурага" і ягоны крывавы след, пакінуты сярод беларускага насельніцтва Беласточчыны зімой 1946 года. Упершыню ў агульнапольскім эфіры палякі маглі пачуць не толькі з вуснаў беларусаў, але і падуладных „Бурага", што іхні камандзір паводзіў сябе мякка кажучы па-садысцку. Але мяне найбольш уразілі разыходжанні ў ацэнцы ягонай асобы зробленай жаўнерамі АК з Віленшчыны і падляшскімі „ідэйнымі байцамі". Паводле першых, дзеянні „Бурага" ў дачыненні да нашых продкаў гэта бандытызм, паводле другіх — па-„геройску" здзейсненая „цывілізацыйная місія". І тых, хто сёння адмаўляе нам права на нашую, беларускую грамадска-палітычную прысутнасць, дастаткова сярод палітыкаў розных партый.

Фільм пра „Бурага" каментавалі мы са Славамірам Іванюком у беластоцкай радыёперадачы Юркі Ляшчынскага „Пад знакам Пагоні". Славамір Іванюк выказаў спадзяванне, што нягледзячы на спробы з боку псеўданавукоўцаў і некаторых польскіх ветэранскіх асяроддзяў, Беластоцкае аддзяленне Інстытута нацыянальнай памяці аб'ектыўна расследуе справу „Бурага" да канца, а праўда, хаця нявыгадная частцы польскага падполля, будзе выяўлена. І вось нядаўна журналістка беластоцкай штодзённікі „Кур'ер паранны" ў размове з начальнікам следчага аддзялення ІНП Дар'юшам Альшэўскім пра завяршэнне гэтай справы піша: „ W świetle dotychczasowych ustaleń prokuratury IPN to „Bury" winny jest zabójstwa 30 furmanów i pacyfikacji kilku białoruskich wsi w powiecie bielskim zimą 1946 roku. Śledztwo potwierdza, że mordu dokonano także na tle narodowościowym".

Сумная гістарычная і маральная праўда, вядомая беларусам Польшчы, урэшце прызнаная. **І сем'і забітых непасрэдна па загадзе „Бурага", але і тыя, якія загінулі з рук іншых арганізацый польскага падполля ці звычайных бандыцкіх груп, павінны дачакацца з боку польскага ўрада маральнай і матэрыяльнай кампенсацыі**. „Буры", „Лупашка" і іншыя „змагарныя камандзіры і жаўнеры", якія праследавалі беларускае насельніцтва, не павінны быць узорам патрыятычна-адукацыйнага выхавання ў Польшчы. Мы ведаем пра выстаўкі, альбомы, вечарыны памяці, помнікі ў го-

[працяг ☞ 2]

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Каманда бельскай „тройкі"

Слалам у народных кашулях

Ганна Кандрацюк

Яшчэ далёка да турніру ў падляшска-беларускіх школах нешта зварухнулася. Удзел у І турніры „Беларускія ігры і гульні", які адбыўся 16 лістапада г.г., унёс ажыўленне ў школы. У адных гімназіях творчае хваляванне і прага перамогі закранулі ўсіх, у іншых (яны ў большасці) — толькі групку навучэнцаў і настаўнікаў беларускай мовы.

З самага рання ў бельскую „тройку" з'ехалася процьма ўдзельнікаў — запрашэнне да ўдзелу прыняло дзесяць гімназій. Разам з камандамі іх настаўнікі і дырэктары школ, а таксама сябры, бацькі, сваякі...

Не абышлося і без важных гасцей — на турнір прыехаў консул Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карачун. З'явіліся прадстаўнікі мясцовай улады, асветы, медыяў і сам спонсар Яўген Вапа, дырэктар Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

Дэкор

Спецыяльна пад турнір гаспадары надзьмулі сотню белых і чырвоных шарыкаў, каб зрабіць з іх дэкор-сцяг. Сцяг, вядома, бел-чырвона-белы. Каманда з Бельска яшчэ і на адзенні памясціла незалежніцкі беларускі сцяжок. Менавіта — кашулькі ўдзельнікаў вылучаліся вынаходлівасцю, на іх было ўсё: народныя арнаменты, дубы, грыбы, словы вядомых песень, сімволіка, назовы клубаў або школьнага тэатра, кветкі, народныя касцюмы. І што цікавае — амаль усе пакарысталіся тут грантам Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

Дэкаратыўнасць, у якой так добра адчувае сябе наша меншасць, найбольш бачылася з боку галёркі, дзе выстойвалі балельшчыкі. Тут, хаця і сустракаліся беларускія лозунгі, гучала амаль выключна польская мова. А вось дзяўчаты з Нараўкі і Беластока, не толькі падрыхтавалі лозунгі па-беларуску, але і „кібіцавалі" сябрам... Неверагодна, але цудоўна. Вось Нараўка, да кожнай канкурэнцыі падрыхтавала беларускі лозунг і вокліч у арыгінале: „Нааарааўка! Нааарааўка!"

Замысел

Найбольш эмоцый прынеслі спартыўныя спаборніцтвы. Спорт, дарэчы, вырашаў аб перамозе. І невыпадкова. Аўтар праекта — Уладзімір Васілюк, настаўнік фізкультуры ў бельскай „тройцы". Прапанаваў ён удзельнікам нашы традыцыйныя гульні, як пікер, дрындушкі, каменьчыкі, слалам на дыбах (апішам іх на старонках „Зоркі") і канкурэнцыі, хаця спачатку палохалі, у канцы — захапілі.

— Гэта вельмі інтэлігентная гульня, — каменціравалі сябры пасля згаданы пікер, — у ім апрача лоўкасці неабходная кемлівасць.

У часы майго дзяцінства ўсе ведалі гэтыя гульні, — кажа Уладзімір Васілюк, — гэта наш, мясцовы, спорт.

— Дрындушкі! То-ж калісь усе ў іх гулялі, — успамінае Сяргей Лукашук, дырэктар Бельскага дома культуры і заадно член журы турніру — толькі калісь мы замест абруча качалі жалезнае кола ад воза.

[працяг ☞ 3]

Павучальнае Еўрабачанне ☞ 4

Кася, прадстаўніца Польшчы на шаснаццаць выканаўцаў (да 15 гадоў, выбраных з ліку 36 тысяч маладых спевакоў-аўтараў песень на сваёй роднай мове) заняла апошняе месца. Найбольш павучальнае, з майго пункту гледжання, было тое, што яе гонару баранілі толькі тэлегледачы з Беларусі.

Дапамагчы іншым ☞ 5

Барбара Андрасюк — чацвёртая ўжо вучаніца Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, якая атрымала стыпендыю ўстаноўленую спадаром М. С. (хоча ён захаваць ананімнасць) з Варшавы. Нядаўна фундатар разам са сваёй жонкай наведалі Гайнаўскі белліцэй і спаткаліся са стыпендыяткай.

Культура ў Орлі ☞ 8

„Арляне" з'яўляюцца падляшскім мастацкім даўгавечнікам. У сваім рэпертуары маюць беларускія народныя песні, глыбока ўкаранелыя на арлянскай зямлі, беларускі апрацаваны фальклор і творы сучасных беларускіх кампазітараў. Цяжка паверыць, але гэты калектыў існуе ўжо 57 гадоў!

Першыя крокі ☞ 9

Спачатку хачу дакладней пазнаёміцца з дзейнасцю музея. Трэба будзе займацца бягучымі справамі і парадкаваннем экспанатаў. Пасля трэба будзе здаваць у музейнае карыстанне ўсе будынкі і юрыдычна ўрэгуляваць справу ўласнасці зямлі — зараз уласнікам зямлі з'яўляецца Галоўнае праўленне БГКТ, а будынкі належаць да Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы".

Доўгая Трасцянка ☞ 10

Не дарма называлі Міхала Астроўку „народным трыбунам" — да сёння ў яго мове засталіся словы *народ, патрыятызм*... Некаторыя лічылі, што быў звычайным самазванцам, ён, не вельмі вучаны, іншыя мяркуюць, што калі б меў шанц вучыцца, дык і вялікім чалавекам быў бы!

Трэба рэфармаваць кааператыў ☞ 11

У 2002 годзе пры кааператыве „Рольмак" узнікла суполка з абмежаванай адказнасцю „Фармпаш". „Рольмак" атрымаў у ёй 35% паёў, а апошнія купілі фізічныя асобы. Новая суполка будзе займацца скупкай збожжа і перапрацоўкай яго на корм для жывёл. Апошнім часам шырэй адкрыўся ўсходні рынак і „Рольмак" перапрадае туды мясныя прадукты.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Старшыня КДК Беларусі А. Тозік у Польшчы

17-18 лістапада гэтага года адбыўся візіт старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Анатоля Тозіка ў Рэспубліку Польшча. Візіт адбыўся па запрашэнню старшыні Вышэйшай кантрольнай палаты Польшчы Міраслава Сэкулы. У сустрэчах і перамовах, якія прайшлі ў рамках візіту, прыняў удзел пасол Беларусі Павел Латушка.

Згаданы візіт з'яўяецца першым кантактам кіраўнікоў вышэйшых кантрольных органаў Беларусі і Польшчы за апошнія 7 гадоў. Візіт быў падрыхтаваны па ініцыятыве і арганізацыйным садзейнічанні Пасольства РБ.

У ходзе візіту адбыліся перамовы дэлегацый. Кіраўнікамі вышэйшых кантрольных органаў было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж КДК Беларусі і ВКП Польшчы. Дасягнута дамоўленасць па развіццю супрацоўніцтва ў накірунках абмену вопытам у галіне ажыццяўлення дзяржаўнага кантролю, узаемадзеянні ў прафесійным навучанні кадраў, правядзенні паралельных кантрольных мерапрыемстваў, інфармацыйным абмене, была падкрэслена неабходнасць развіцця кантактаў як паміж дэпартаментамі цэнтральных устаноў, так і рэгіянальных органаў кантролю Беларусі і Польшчы.

Бакі абмеркавалі неабходнасць развіцця ўзаемадзеяння ў сферах экалогіі, трансгранічнага супрацоўніцтва, супрацоўніцтва ў рамках міжнародных кантрольных арганізацый. Адзначана зацікаўленасць у прапрацоўцы з украінскім і літоўскім бакамі магчымасці правядзення трохбаковых кантрольных мерапрыемстваў.

Дэлегацыя Беларусі азнаёмілася са структурай, накірункамі дзейнасці ВКП, у тым ліку ў сферы кантролю за выкананнем бюджэту, аховы навакольнага асяроддзя.

Падчас знаходжання А. Тозіка ў Варшаве адбылася сустрэча з першым намеснікам Міністра фінансаў — дзяржаўным інспектарам казначэйскага кантролю Веславам Цясельскім і намеснікам Міністра фінансаў Польшчы Яцкам Учкевічам з удзелам кіраўнікоў шэрагу дэпартаментаў міністэрства. Дасягнута дамоўленасць аб неабходнасці распрацоўкі і падпісання ў бліжэйшы час міжведамасных пагадненняў паміж КДК Беларусі і Мінфінам Польшчы ў галіне кантрольнай дзейнасці ў падатковай сферы і сферы фінансавых расследаванняў.

Кіраўнік кантрольнага ведамства Беларусі правёў таксама сустрэчу з першым намеснікам Міністра аховы навакольнага асяроддзя Польшчы Кшыштафам Шамалкам і намеснікам Міністра аховы навакольнага асяроддзя Польшчы Эвай Сыманідас.

У рамках сустрэчы адбыўся абмен думкамі па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і ажыццяўлення кантрольных функцый у згаданай сферы. Бакі пагадзіліся ў неабходнасці актывізацыі працы па заключэнню міжурадавага пагаднення аб супрацоўніцтве ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і міжурадавага пагадненння па пытаннях прыгранічных вод. Была падкрэслена неабходнасць ажыццяўлення кантрольных мерапрыемстваў па забеспячэнню стандартаў экалогіі ў Белавежскай і Аўгустаўскай пушчах, Палессі, басейнах рэк Заходні Буг і Нёман.

Найбольшая ўвага падчас сустрэчы была нададзена пытанню рэканструкцыі Аўгустаўскага канала, у тым ліку памежнага шлюза Кужынец. Бакі пагадзіліся стварыць у бліжэйшы час рабочую групу экспертаў дзеля акрэслення прававых, фінансавых прынцыпаў і тэхнічных аспектаў рэканструкцыі Аўгустаўскага канала. Абодва бакі падкрэслілі неабходнасць уключэння Аўгустаўскага канала ў спіс помнікаў гістарычнай спадчыны ЮНЕСКА. Дасягнута дамоўленасць аб ажыццяўленні шэрагу падрыхтоўчых мерапрыемстваў, каб у сярэдзіне 2004 года пачаць рэканструкцыю памежнага і трох беларускіх шлюзаў Аўгустаўскага канала.

Візіт прайшоў у дружалюбнай і канструктыўнай атмасферы.

Інфармацыйны бюлетэнь Пасольства РБ у Польшчы

Партыйная безнадзейнасць

Няма ніякай таямніцы ў тым, што палітычнае жыццё ў Беларусі старонняму назіральніку амаль незаўважнае. І гэта зразумела — палітычныя партыі, як галоўныя складаючыя палітычнай сістэмы, сёння больш займаюцца тым, каб выжыць, утрымацца неяк „на паверхні", канчаткова не растварыцца ў бязмежжы палітычнай манатоннасці фактычнага прэзідэнцкага самаўладдзя. Менавіта такія абставіны штурхаюць розныя беларускія партыі да кансалідацыі, аб'яднання задоўга да новых выбараў і іншых палітычных кампаній. Але, згодна законаў прыроды, на кожнае дзеянне ёсць супрацьдзеянне.

Наўрад ці шырокую грамадскасць Беларусі ўскалыхнуў факт перадачы ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу новых дапаўненняў і змяненняў у законы, што тычацца палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Сумніўна, што і большасць шэрагоўцаў гэтых самых партый увогуле даведаліся аб такой падзеі, бо звонку яна нічым яскравым не вызначаецца. Адзінае пытанне, якое можа раптоўна з'явіцца — а яны ж (г.зн. дэпутаты парламента) толькі ж улетку змянялі гэты самы закон „Аб палітычных партыях", няўжо не ўсё змянілі адразу? І атрымліваецца, што не ўсё. Разгляд палітычнай сітуацыі ў Беларусі, вобразна кажучы, „пад мікраскоп" наводзіць на думку, што хоць беларускія палітычныя партыі і самыя слабыя ва ўсёй Еўропе, маюць яны сур'ёзны патэнцыял, з якім хоча ці не хоча, але мусіць лічыцца лукашэнкаўская ўлада.

Улетку ўсё наводзіла на думку, што Беларусь ушчыльную падышла да значных палітычных падзей. Аб магчымым рэферэндуме па зменах у Канстытуцыю, што дазволяць цяперашняму прэзідэнту заставацца на сваёй пасадзе на ўсё ягонае жыццё распавядалі многа і ўсур'ёз. Перспектыва блізкага рэферэндуму засланіла нават вызначаныя на восень наступнага года выбары ў беларускі парламент. Менавіта на лета прыйшлася кансалідацыя апазіцыйных палітычных партый, якая пад восень вылілася ў адносна важкія аб'яднанні. Адначасова і ў палітычна „бесколерным" парламенце прымаюцца папраўкі, якія зрабілі больш жорсткімі патрабаванні да правядзення палітычнымі сіламі масавых акцый і значна ўзмацнілі адказнасць арганізатараў за парушэнні закону. Прыкладам можна назваць магчымасць закрыцця праз суд палітычнай партыі нават за адзінае парушэнне заканадаўства аб масавых акцыях. Зразумела, партыйныя лідэры выказалі свой пратэст з гэтага новаўвядзення, але „гуляць" ім прыйдзецца менавіта па вышэйазначаных „правілах".

Час ішоў і рознагалоссі ў пытаннях будаўніцтва беларуска-расійскай саюзнай дзяржавы паспрыялі таму, што з рэферэндумам прэзідэнцкая ўлада вырашыла пачакаць. Тым не менш, механізм кансалідацыі партый аказаўся насамрэч уключаны. Сёння можна канстатаваць аб з'яўленні двух цэнтраў апазіцыі. Першы — аб'яднанне „5+", куды ўвайшлі пяць палітычных партый (БНФ, Аб'яднаная грамадзянская партыя, сацыял-дэмакратычная Грамада, партыя працы, камуністы) разам з шэрагам грамадскіх арганізацый, апазіцыйна настроенымі дэпутатамі мясцовых саветаў і Палаты прадстаўнікоў, другі — так званая еўрапейская кааліцыя „Свабодная Беларусь", дзе таксама прысутнічаюць дзве партыі (сацыял-дэмакратычная партыя „Народная Грамада" і партыя жанчын „Надзея"), але большую частку складаюць грамадскія арганізацыі і шэраг вядомых у Беларусі асоб. Асноўная мэта і той, і другой кааліцыі — правядзенне як мага большай колькасці дэпутатаў у парламент. Зыходзячы з разумення таго, што аніводнай палітычнай партыі самастойна дасягнуць сваіх мэтаў не пад сілу, дадзеныя аб'яднанні маюць рэальны шанц паўплываць на змену палітычнай сітуацыі ў Беларусі ў бок яе паляпшэння.

Але ў прэзідэнцкай адміністрацыі далёка не ўсе чыноўнікі ядуць свой хлеб дарма. У верасні з'явіўся дэкрэт, які зацвердзіў парадак рэгістрацыі саюзаў (асацыяцый) палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, „разынкай" якога падаецца неабходнасць афіцыйнай рэгістрацыі з усімі патрэбнымі працэдурамі такіх саюзаў у органах юстыцыі ў той час як удзельнічаць у выбарах такія аб'яднанні права не маюць. Гэта значыць не маюць права ні вылучаць кандыдатаў, ні за іх агітаваць, ні ствараць нейкія выбарчыя блокі. За два парушэнні, вынесеныя такому партыйнаму саюзу міністэрствам юстыцыі ён ліквідуецца. Цяпер нормы дэкрэта маюць перайсці ў закон „Аб палітычных партыях".

Зразумела, такія змены ў заканадаўстве накіраваныя менавіта супраць эфектыўнай дзейнасці вышэйазначаных кааліцый — „пяцёркі" і „Свабоднай Беларусі". Дабівацца змены палітычнай сітуацыі без кансалідаванага ўдзелу ў выбарах калектыўных і індывідуальных членаў гэтых аб'яднанняў легальна немагчыма, бо выстаўленне кандыдата ад кааліцыі, ці нават абвяшчэнне падтрымкі якога-небудзь кандыдата кааліцыяй вядзе да парушэння закону.

Да чаго штурхае такое новаўвядзенне ў палітычным жыцці Беларусі? Маю два адказы. Першы (верагодны): кожная партыя як і раней стане весці агітацыю на карысць сваіх нешматлікіх вылучэнцаў, якія будуць мець больш-менш рэальны шанц прайсці ў заканадаўчую ўладу. Другі (наіўны): партыйныя лідэры адкінуць уласныя амбіцыі і паспеюць аб'яднацца да абвяшчэння выбараў у новую, хай сабе і часовую, але адзіную апазіцыйную партыю.

Уладзімір Лапцэвіч

Памяць народа таксама ў трагічным мінулым

[1 ☞ працяг]

нар гэтых „герояў". Дык што зараз з самой рэабілітацыяй „Бурага", якая была праведзеная ў 1990-я гады? Падобнае пытанне паставіла пракурору Альшэўскаму і журналістка „Кур'ера паранага". У адказ пачула, што пракурор не бачыць законных магчымасцей адмяніць існуючую сітуацыю. А вось самы трывожны фрагмент вышэйзгаданага інтэрв'ю:

Kurier Poranny: Jak to? Stwierdza Pan, jako prokurator IPN, że była to zbrodnia i mówi jednocześnie, że nie ma podstaw, by zweryfikować orzeczenie, które głosi coś przeciwnego?

Dariusz Olszewski: Sąd unieważnił poprzedni wyrok i stwierdził, że „Bury" także w ten sposób walczył o niepodległą Polskę. Ja nie oceniam, czy ten wyrok jest słuszny czy nie. Ja mówię, że jest zgodny z przepisami. W oparciu o wyniki śledztwa nie będę żądał wzruszenia tego orzeczenia...

Для гістарычнай дакладнасці хачу прыпомніць, што вяртанне „Бурага" ў лік герояў за такі „спосаб" змагання за незалежную Польшчу адбылося калі міністрам юстыцыі быў Владзімеж Цімашэвіч. Што абазначаюць гэтыя словы пракурора? — што ёсць горшыя ахвяры і лепшыя каты? Злачынства супраць мірнага беларускага насельніцтва ніколі не павінна падпадаць пад тэрмін даўнасці. І той, хто дапусціўся такіх злачынстваў, заўсёды падлягае пакаранню, згодна з міжнародным заканадаўствам, якое падпісала Польшча. Хачу нагадаць, што зараз адбываюцца суды над тымі, хто вінаваты ў этнічных чыстках на Балканах. А тут пракурор адмаўляецца ўзбудзіць справу, якая, паводле ягоных расследаванняў, з'яўляецца генацыдам па этнічных прычынах. Асівець і звар'яцець толькі застаецца. Не найлепей гэта прарочыць для нас, як меншасці, у змаганнях у гэтай справе з адміністрацыйна-судовым апаратам краіны. Ці ў змозе надалей ваяваць на судовай дарозе ў гэтай справе сем'і ахвяр. Ці не будуць яны надалей са сваімі сямейнымі няшчасцямі выкарыстоўвацца інструментальна тымі, каму важныя толькі галасы выбаршчыкаў, а не гістарычная справядлівасць і беларуская годнасць. У гэтым месцы хачу нагадаць, што дзякуючы таксама руплівасці журналістаў „Нівы", „Часопіса", беларускіх перадач Беластоцкага радыё і тэлебачання, Радыё „Рацыя" ці „Беларускім гістарычным сшыткам" адбудоўвалі мы памяць народа таксама і пра трагічнае мінулае. Можна ўжо зараз уявіць, колькі трэба прысвяціць часу, стараннаў і сродкаў, каб да канца высветліць беларуска-польскія суадносіны на Беласточчыне пасля вайны. Колькі мусіць мінуць яшчэ часу, каб мы маглі паставіць помнікі і астатнім ахвярам, калі каты перастануць быць героямі, калі ў адносінах да нас, беларусаў, з боку ўлад пачуем хрысціянскае слова прабачце. Будзем чакаць.

Яўген Вапа

Чалавеку трэба ведаць сваё мінулае

„Мы тут ёсць, каб пазнаваць сваё мінулае і сваю беларускасць”, — так Андрэй Сцепанюк, намеснік дырэктара Бельскага беларускага ліцэя, прывітаў удзельнікаў VIII Дыскусійнага семінара, які адбыўся ў Бельску 15 лістапада пад лозунгам „Беларусы Бельшчыны”. „Як дрэву патрэбны карані, так чалавеку трэба ведаць сваё мінулае — не толькі гісторыю народа, але таксама сям’і . Хто з нас пералічыць сваіх продкаў да пятага пакалення?” — працягваў думку Яўген Вапа, старшыня Беларускага саюза ў Рэчы Паспалітай, арганізатар семінара.

Гісторыю Антыховічаў — аднаго з мяшчанскіх бельскіх родаў не да пятага пакалення, а да XVIII стагоддзя, прадставіў Дарафей Фіёнік. Гісторыя гэтая сама па сабе цікавая хаця б таму, што рознілася ад сямейных гісторый удзельнікаў семінара, продкі якіх у большай частцы былі сялянамі. Хаця Лімонка прыехала з самога Беластока, каб больш даведацца пра Антыховічаў, якія, у далёкім — яе продкі. Удзельнікі семінара мелі магчымасць пабачыць арыгінальныя тастаманты, дагаворы ці лісты Антыховічаў.

Пасля кароткага перапынку Збігнеў Місюк, студэнт пятага курса археалогіі, падвёў вынікі сваіх сёлетніх знаходак на тэрыторыі Бельска. Быў гэта яшчэ адзін вялікі крок у вывучэнне мінулага — прадметы, якія прэзентаваў, паходзілі нават з XII стагоддзя. Самае цікавае, што прысутныя маглі на экспанаты не толькі паглядзець, як гэта бывае ў музеях, але таксама да іх дакрануцца. Чаго там не было: старажытныя кафлі для печак, кухонныя ножыкі і да гарбавання шкураў, гузікі, серп, і шмат чаго яшчэ. Найбольш, здаецца, навукоўцы і мясцовыя аматары, якія многа пры раскопках дапамагалі, знайшлі розных відаў пасуды. Як сказаў малады археолаг, знойдзеныя прадметы паказваюць нам як выглядала колішняе жыццё: „Ведаем, што бяльшчане даўно ўжо займаліся тым самым, чым займаюцца і сёння, напрыклад, даволі шмат знайшлі мы куфляў”. Як відаць, дакладчык быў не толькі разумны, але таксама дасціпны.

Зусім не ў жартоўным, хаця і не ў сумным настроі прайшла трэцяя частка сустрэчы. План семінара быў так прыдуманы, каб удзельнікі пакаштавалі ўсяго патроху. Гісторыя, археалогія, ...паэзія. Надзея Артымовіч, так моцна звязаная з Бельскам, не толькі сённяшнім, але можа, перш за ўсё, тым запамятаным з дзяцінства, распавядала аб часах, калі яшчэ лета было летам, зіма зімой, калі сям’я значыла больш чым толькі „група людзей, што жывуць разам”. Яўген Вапа, які вёў размову і добра ведае паэтэсу, нават здзівіўся. Даўно ўжо Надзя (як яе называе) не казала так шмат пра сябе. Яго самога зацікавіла, калі Дама Беларускай Паэзіі паясняла свае вершы, што даволі рэдка ёй здараецца. Хто не быў, няхай шкадуе! Гэтай часткай праграмы захаплялася таксама Аня, ліцэістка з Бельска. Хаця не ўсё яшчэ разумее па-беларуску, прыемна было ёй слухаць Надзею Артымовіч: „Некалі быў у нас у школе адзін паэт, такі нецікавы: піша, бо піша, па-беларуску, бо лягчэй выдаць... А тут — зусім па-другому! Спадарыня Надзея гэта сапраўдная артыстычная душа! Я бачыла яе аднойчы ці двойчы, але раней не чула ніколі. Не спадзявалася нават, што гэта аж так цікава! Трэба будзе пазычыць зборнік яе вершаў!”

Пашана і любоў да паэзіі Надзеі Артымовіч, здаецца, усеагульная не толькі для бяльшчан. Песня на яе словы, а таксама „Не плач, Айчына” Андрэя Сцепанюка пачалі своеасаблівыя „вэчуркі” ў Музеі Малой Айчыны ў Студзіводах, куды ўдзельнікі семінара падаліся пасля абеду. Усе цесным кругам згуртаваліся вакол печкі, што безумоўна спрыяла інтэграцыі...

Інтэграцыя — важнае слова, калі гаварыць аб семінары. Яўген Вапа заявіў, што арганізатары вырашылі падобныя сустрэчы ладзіць штогод з мэтай не толькі пашыраць веды, але таксама наблізіць вучняў двух братніх Бельскага і Гайнаўскага беларускіх ліцэяў. Сам ён, зрэшты, на сабе спраўдзіў, што такая інтэграцыя можа быць вельмі плённай — ён жа з-пад Гайнаўкі, а яго жонка з Бельска. Ґжэсь, вучань Бельскага белліцэя, таксама не супраць інтэграцыі... „Калі так цяжка проста падысці да кагось і загаварыць... Можа наступным разам”.

Маеш шчасце, Гжэсю, „наступны раз” ужо праз год. Варта і вам, дарагія, туды будзе выбрацца, каб сустрэць Ґжэся, Аню, Лімонку, каб сустрэць сваю мінуўшчыну, нарэшце, каб крыху спыніцца ў штодзённай мітусні і саміх сябе сустрэць і лепш пазнаць.

Зося Лемеш

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Слалам на дыбах

Слалам у народных кашулях

[1 ☞ працяг]

Некаторыя ўдзельнікі толькі ў час турніру навучыліся гульні ў пікер.

— Мы не ведалі як і што, — прызнаецца настаўніца Галіна Трашчотка з Дубіч-Царкоўных. А яны самі навучыліся тут на месцы і як змагаліся!..

Інакш у Нараўцы, спартыўных гульняў навучылі настаўніцы беларускай мовы. Папраўдзе, толькі Бельск і Орля мелі прафесійную падрыхтоўку і адборныя каманды. І на турніры яны больш напаміналі інструктараў, як удзельнікаў...

Разнавіднасць

Цікавасць і поспех праекта — у яго разнавіднасці і кампактнасці. Апрача спорту ўдзельнікі паказаліся як мастакі, навукоўцы, спевакі, кухары, лакальныя патрыёты. Найбольш паспяхова дэманстравалася віктарына на тэму беларускай літаратуры, гісторыі, геаграфіі і палітыкі. Усе ўдзельнікі набралі максімальную колькасць балаў (гэта, так сказаць, абавязковая дзялянка настаўніка беларускай мовы), у песні найпрыгажэйшая была Орля, у мастацтве: Гарадок, Беласток, Бельск, у кухні — Беласток і Дубічы-Царкоўныя, у прэзентацыі і аўтакрэацыі — Гайнаўка н-р 2, а ў легендзе і выступленнях — Бельск-Падляшскі. Варта адзначыць, што аўтару праекта дапамагалі многія настаўнікі гімназіі.

Журы ў складзе: старшыня Тамара Русачык, Сяргей Лукашук і ніжэйпадпісаная (члены) усе пазаспартыўныя канкурэнцыі ацаніла надзвычай высока, аднак у перамозе вырашыў спорт, які ацэньваў алімпіец з Барселоны Яўген Бэдэнічук.

Вынікі

I месца — Гімназія ў Орлі,
II месца — Бельск-Падляшскі,
III месца — Нараўка,
IV месца — Гайнаўка,
V месца — Дубічы-Царкоўныя,
VI месца — Гайнаўка н-р 2,
VII месца — Беласток,
VIII месца — Аўгустова,
IX месца — Гарадок,
X месца — Кляшчэлі.

Падвядзенне

Удзельнікі, якія пасля ненайлепшага выніку адчувалі стрэс і загубленасць, мелі нагоду „разарвацца” ў час дыскатэкі пры беларускай музыцы „дыска-пола”. Гімназістам, пачынальнікам з Беластока, якія выступілі ўсе да аднаго, належыцца добрае слова за адвагу. Яшчэ раз высветлілася старая праўда — каб заваяваць поспех, трэба ўмець гуляць. І найважнейшая тут прысутнасць. У канцы канцоў турнір — гэта гульня і забава.

Ганна Кандрацюк

Хто пацікавіцца?

Едучы на цягніку ў Беласток бачыў я, што побач элеватараў у Бельску-Падляшскім стаялі дзесяткі вагонаў, прызначаных на лом. Суразмоўцы казалі, што прыватны прадпрымальнік выкарыстоўвае іх для перавозкі вугалю з Семяноўкі, а крытыя вагоны — на склады для ўгнаенняў. Усё адбываецца паводле дагавораў з чыноўнікамі чыгуначных службаў.

Нядаўна я загаварыў наконт гэтай справы з бельскім чыгуначнікам (прасіў захаваць ананімнасць).

— Гэта скандал, каб вагоны прызначаныя на лом і знятыя з уліку, выкарыстоўваць для чыгуначнага транспарту. Гэта ж пагражае аварыяй.

Хто дазваляе на такія здзелкі? Няўжо дырэктары не бачаць балагану? Здаецца, што хтосьці „адпаведную касу” ўзяў за гэта. Але змова маўчання абавязвае чыгуначных начальнікаў. Няўрадавыя ўстановы, як і мясцовыя самаўрады паводзяць сябе паводле прымаўкі: „Нічога не знаю, бо мая хата з краю”.

Паводле майго суразмоўцы, украінскі вугаль (па 300 зл. за тону) вандруе з перагрузкі ў Семяноўцы не толькі ў Бельск-Падляшскі, але і ў Лапы і Шэпятова.

— Я б пазакрываў усе шахты на Шлёнску, — канстатаваў суразмоўца, а прыватным прадпрымальнікам дазволіў удвайне імпартаваць „рускі” вугаль па меншай цане, каб палякі навучыліся рыначнай эканомікі. Людзям была б нейкая карысць.

Так ці інакш, ёсць праблема. На маю думку, кампетэнтныя органы павінны гэтым пацікавіцца. (ус)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Змаганні ацэньваў алімпіец Яўген Бэдэнічук

Вачыма паляка

Павучальнае Еўрабачанне

У апошні час на Беласточчыне і Сувальшчыне прабываў віцэ-міністр культуры Рафал Скомпскі. У Беластоку наведаў ён некаторыя ўстановы культуры, м.інш. Драмтэатр і Падляшскі музей. У Сейнах прыняў удзел у Сустрэчы нацыянальных меншасцей. Пры нагодзе прызнаўся журналістам:

— Гэты рэгіён, такі багаты, павінен бачыцца іначай у будучыні, калі гаворка пра фінансаванне культуры, пра дапамогу з цэнтральнага бюджэту, са спецыяльных сродкаў з фірмы „Totolotek", — і зазначыў, што не без значэння таксама ў фінансавым фактары шматнацыянальнасць і шматкультурнасць Падляшша, асабліва пасля ўваходу ў наступным годзе Польшчы ў Еўрасаюз.

— Пры ўваходзе ў Еўрасаюз гэта мае значэнне, бо нашы адносіны да культуры меншасцей, а затым і культуры іншых народаў, з якімі сустрэнемся ў ЕС, будзе сведчыць аб адносінах да нас. Пашана своеасаблівасці, адрознасці, яе разуменне — гэта таксама паўплывае на трактаванне польскай культуры як цэласці. Дапамога ўсім існуючым на Падляшшы месцам культывавання культурнай адметнасці можа даць працэнты ў ЕС.

Віцэ-міністр Скомпскі не адказаў аднак, як тыя дэкларацыі і вельмі слушныя словы перакладуцца ў бюджэце будучага года на дафінансаванне мерапрыемстваў нацыянальных меншасцей. Дарэчы, цяжка ад яго такіх дэкларацый патрабаваць (у лістападзе). Па-першае — зарана, па-другое — адказ, мабыць, быў бы ўхілісты. Вядома ж, што бюджэт 2004 года мае быць бюджэтам скарачэнняў, значыць, як гэта акрэсліў віцэ-прэм'ер Гаўзнер — адрачэнняў. Ужо вядома, што ўрад намерваецца ахапіць імі таксама цэлыя групы найслабейшых, а, значыць, ахвотна таксама і ўсю сферу культуры з яе яшчэ слабейшай часткай — меншасцямі. Уся надзея ў „Таталётку", з якога значныя грошы маюць цяпер ісці на культуру. Няма, аднак, гарантыі, што і з гэтай пулькі арганізатары меншасных мерапрыемстваў штосьці ўшчыкнуць, нават калі б масава задэкларавалі, што кожны дзень запоўняць купоны „Вялікага" ды „Мульты" „лёткаў" ці палка будуць сціраць пазалотку са „здрапак" Спартыўнага лато, нават пры спасылцы на, як гэта кажа віцэ-міністр, ушанаванне адметнасці. Дарэчы, не без значэння факт, што Рафал Скомспкі ўжывае дыпламатычных акрэсленняў: *Ten region w przyszłości powinien być inaczej postrzegany*. Па-першае, слова *павінен* у вуснах віцэ-міністра не азначае, што гэтак мусіць быць на думку ўсяго кабінета міністраў і парламента, здамінаванага тою самай кааліцыяй. Па-другое, не без прычыны пан Скомпскі зазначае: „у будучыні".

Культура заўсёды была найбольш зручная да фінансавых скарачэнняў. А зараз да таго ўрад, а сярод гэтага і ведамства культуры можа паказаць на іншыя крыніцы здабыцця грошай — еўрасаюзныя сродкі.

Тым часам, тыдзень да візіту віцэ-міністра Скомпскага, гасцявала ў Беластоку міністр па еўрапейскіх справах Данута Гюбнэр. Пры нагодзе гасцям і журналістам, удзельнічаючым у сустрэчы з паняй міністр, былі ўручаны кілаграмы выданняў наконт уваходу Польшчы ў ЕС і дапамогі, на якую можам разлічваць. Сярод іх апынуўся „Праект трактата ўстанаўліваючага Канстытуцыю для Еўропы". Рашыў я быць адным з нешматлікіх, мабыць, грамадзян Польшчы, які прачытае ўсё гэта ад коркі да коркі. На больш за 250 старонках, задрукаваных макам, уважліва мог я прачытаць толькі да 64 старонкі. Не быў у змозе разабрацца ў частках, раздзелах, загалоўках, секцыях ды падсекцыях, на якія ён падзелены. Аднак, не гэта было найгоршае ў штудзіраванні па-польску ўступнага канстытуцыйнага еўрапейскага дакумента і не ўспамінаю тут пра шматлікія стылістычныя і граматычныя памылкі. Калі дабраўся я да тае 64 старонкі, натрапіў на, здавалася б, цікавы Артыкул III-12 (у Загалоўку II, Часці III). Пачынаецца ён гэтак: „Мовы, у якіх кожны грамадзянін мае права звяртацца ва ўстановы і дарадчыя органы згодна з артыкулам I-8 і атрымаць адказ, пералічаны ў артыкуле IV-10". Гартаў я „праект" туды і назад. І нічога. Адпаведных артыкулаў не знайшоў. Папрасіў дапамогі ў некалькіх знаёмых. Шукалі паўгадзіны. Ці і гэтак „празрыста" ў гэтай будучыні, успомненай віцэ-міністрам Скомпскім, будзе выглядаць будучая еўрапейская канстытуцыя ў польскім выданні, на якую спасылацца змогуць польскія меншасці?

Стомлены перагортваннем еўрасаюзных дакументаў, сеў я перад тэлевізарам і пабачыў з сотняй мільёнаў еўрапейцаў І Конкурс Еўрабачання для дзяцей, які перадаваўся з Капенгагена. Кася, прадстаўніца Польшчы на шаснаццаць выканаўцаў (да 15 гадоў, выбраных з ліку 36 тысяч маладых спевакоў-аўтараў песень на сваёй роднай мове) заняла апошняе месца. Найбольш павучальнае, з майго пункту гледжання, было тое, што яе гонару баранілі толькі тэлегледачы з Беларусі. Мабыць, пачулі польскага тэлекаментатара, які ў час галасавання ўскрыкнуў: *Módlmy się o jakieś punkty dla Polski!*. Дзякуючы грамадзянам Беларусі Кася атрымала адзіныя тры балы за песеньку „Coś mnie kręci". У сваю чаргу дзесяцігадовая, светлавалосая Оля Сацюк, прадстаўніца Беларусі з Кобрына, выклікала фурор, спяваючы „Танцуй". І хоць апынулася на чацвёртым месцы, заваявала сэрцы шматлікіх телегледачоў ва ўсіх краінах удзельнічаючых у „малым" Еўрабачанні. Максімальную колькасць балаў (па 12) далі ёй Харватыя і... Польшча. Па дзесяць балаў атрымала Оля ад Латвіі, Македоніі і Нарвегіі. Агулам дасталіся ёй 103 балы і маладая спявачка прайграла ледзь 15 баламі з маладым брытанцам, 22 з іспанцам і 31 — з лаўрэатам першага месца, вельмі таленавітым Дзіна з Харватыі.

Незалежна ад вынікаў Еўрабачання ў Капенгагене, гэтая падзея — значна больш павучальная, чым прадказванні віцэ-міністра Скомпскага ці чытанні некаторых дакументаў, атрыманых з нагоды візіту міністр Гюбнэр. Што важнае: і Беларусь выходзіць з поспехам на еўрапейскі рынак, прынамсі музычны, праз Еўрапейскі саюз медыяў, ініцыятара дзіцячага Еўрабачання.

Мацей Халадоўскі

Еўропа паварочваецца да Беларусі?

У Варшаве нядаўна адбылася канферэнцыя АБСЕ „Human Dimension Implementation Meeting". Канферэнцыя сабрала вялікую колькасць зацікаўленых людзей, каля 800 чалавек. Былі дэлегацыі ад 53 краін і прадстаўнікі 200 няўрадавых арганізацый.

На такіх канферэнцыях робіцца аналіз стану дэмакратыі і правоў чалавека ў грамадстве краін-удзельніц арганізацыі, ад правоў нацыянальных меншасцей, да правоў вернікаў, вольнасці прэсы і агульнаму стану правоў чалавека.

Беларусь прадстаўлялі афіцыйна дэлегацыя і прадстаўнікі няўрадавых арганізацый (Беларускі Хельсінскі камітэт; Праваабарончы цэнтр „Вясна", Мінскі цэнтр правоў чалавека, „Ратуша", Інстытут правоў чалавека, Беларускае аб'яднанне журналістаў).

Была распаўсюджана інфармацыя аб татальных парушэннях правоў чалавека ў Беларусі.

На жаль, не ўсе прадстаўнікі змаглі атрымаць слова для выступу. Але выступ Таццяны Процькі (БХК) трэба адзначыць асобна. Сканцэнтравала яна свой выступ на вялікай небяспецы для суверэнітэту Беларусі, які зыходзіць ад інтэграцыйных гульняў улады. Прадстаўнік БХК таксама падкрэсліла неабходнасць змен у выбарчым заканадаўстве для правядзення справядлівых і вольных выбараў у Беларусі. Зразумела, без такіх змен цывілізаванае грамадства ізноў не прызнае выбарныя органы ўлады легітымнымі. Таццяна Процька прапанавала распрацаваць механізмы выканання нормаў і рэкамендацый АБСЕ краінамі-ўдзельніцамі.

Пра парушэнні правоў чалавека ў Беларусі згадвалі ў сваіх выступленнях дэлегацыі ЗША (тройчы), Вялікабрытаніі, Еўрапейскага Саюза, Рады Еўропы, а таксама прадстаўнікі Human Rights Watch і Міжнароднай амністыі (Нарвежская філія).

Міжнародная Ліга Хельсінскіх камітэтаў наладзіла „круглы стол" па абмеркаванню парушэння правоў чалавека ў Беларусі, Украіне, Малдове. У гэты ж час з Беларусі прыйшла інфармацыя аб чарговым факце антысемітызму, зняваге і псаванні яўрэйскага помніка.

Прадстаўнікі няўрадавых арганізацый зрабілі шэраг рэкамендацый у планы АБСЕ. Дзейнасць па выкананню зробленых прапаноў можа палепшыць сітуацыю ў Беларусі і паскорыць дэмакратызацыю грамадства.

У 2004 годзе ў Беларусі адбудуцца парламенцкія выбары, таму дэмакратызацыя выбарчага кодэксу Беларусі з'яўляецца ключавым пытаннем.

Валеры Грыцук — прадстаўнік Адукацыйнага цэнтра „Правы чалавека" прапанаваў для АБСЕ праект „Канвенцыі выбарчага працэсу" і выказаў спадзяванне, што Парламенцкая асамблея АБСЕ ўхваліць яе. На думку гэтай арганізацыі ўхваленне Канвенцыі дазволіць спыніць спрэчкі і розныя меркаванні аб дэмакратычнасці ці недэмакратычнасці выбарчага працэсу.

Праблемы са справядлівымі выбарамі часам узнікаюць і ў краінах „старой" дэмакратыі, як гэта гаварыў прадстаўнік англійскай дэлегацыі.

Важным момантам канферэнцыі быў выступ Фраймута Дувэ — назіральніка АБСЕ за вольнасцю слова. Адносна Беларусі ён падкрэсліў наяўнасць відавочнага ўціску і рэпрэсій незалежных выданняў. Пазней у інтэрв'ю для нямецкай газеты „Берлінер цайтунг" Ф. Дувэ ахарактарызаваў Беларусь як „рэцыдыў дыктатуры".

Канферэнцыя АБСЕ скончылася падсумаваннем зробленых рэкамендацый і выніковымі выступленнямі ўдзельнікаў.

Напрыканцы пасяджэння далі слова і прадстаўніку беларускіх арганізацый. Валеры Грыцук выклаў думкі апазіцыі, моцна пакрытыкаваў бяздзейнасць Еўропы ў сітуацыі ўзмацнення дыктатуры ў Беларусі.

Беларускае пытанне разглядалася і на другой імпрэзе — семінары „Рух граніц: Еўрапейскі Саюз і новыя суседзі", арганізаваным таварыствам „Villa Decius" з Кракава і Еўрапейскім культурным фондам з Амстэрдама. Абмяркоўваліся наступныя пытанні: разнастайнасць у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, праблемы культурнай ідэнтычнасці, ацэнка сітуацыі ў галіне культуры і адукацыі, эфектыўнасць дзеянняў сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў для паляпшэння культурных стасункаў.

У семінары ўдзельнічалі прадстаўнікі арганізацый Заходняй Еўропы, журналісты, дэпутаты Вярхоўнай Рады Украіны, прадстаўнікі арганізацый Расіі, Латвіі, Малдовы, Чэхіі, Славакіі.

Беларусь прадстаўлялі 4 асобы, з якіх трое былі выключна пасіўнымі слухачамі (два студэнты, якія навучаюцца ў Польшчы і карэспандэнт радыё Свабода).

Аналізуючы падзеі канферэнцыі і семінара, можна зрабіць наступную выснову: „старая Еўропа" пакуль не зацікаўлена ў вырашэнні „беларускага пытання". Відавочна, што толькі дзякуючы намаганням палітыкаў ЗША і міжнародных праваабарончых арганізацый беларускае пытанне ўсё ж існуе і для еўрапейскіх палітыкаў ды чакае свайго вырашэння ў самым канцы чаргі еўрапейскіх праблем.

Вітаўт Дубоўка

Зацісканне рамяня

На працягу апошніх чатырнаццаці гадоў трансфармацыі нямногае змянілася. Як раней, так і зараз, краіну руйнуюць забастоўкі. Чыгуначнікі, шахцёры, лекары і медсёстры, пажарнікі (заказалі ўжо пратэст мытнікі). Для ўсіх бастуючых адна і тая ж праблема — скарачэнне месц працы, і беспрацоўе. Паводле прафсаюзных арганізацый, віноўнікаў трэба шукаць у кіруючай краінай кааліцыі. Міністр гаспадаркі Ежы Гаўзнер прапануе народу „зацісніць рамень", што дапаможа выйсці з фінансавага калапсу. Праект бюджэту на наступны год прадбачвае ліквідацыю падаткавых ільгот, што ўдарыць па кішэні самых бедных. Не будзе кампенсацыі пенсій. За медыцынскія паслугі і лякарствы трэба будзе больш плаціць.

Параўнаўшы мінулае і сучаснае, можна прыйсці да высновы, што даўней хоць сціплей, весялей жылося. Праўда, прэзідэнт Кваснеўскі канстатаваў, што перыяд чатырнаццацігадовай трансфармацыі не быў затрачаны надарэмна, бо атрымалі свабоду і стаім напярэдадні ўваходу ў еўрасаюзныя структуры, а замест чорна-белага тэлебачання аглядаем каляровае (!!!).

Здаецца, што народ не цешыць каляровае тэлебачанне. Людзі дапамінаюцца працы і хлеба. Ці прапанаванае міністрам Гаўзнерам „зацісканне рамяня" гарантуе беспрацоўным такое? У мяне песімістычныя думкі наконт гэтай справы.

Уладзімір Сідарук

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Усярэдзіне дырэктар Яўген Сачко і Барбара Андрасюк. Збоку спадарства М. С. і А. С.

Дапамагчы іншым

Барбара Андрасюк — чацвёртая ўжо вучаніца Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, якая атрымала стыпендыю ўстаноўленую спадаром М. С. (хоча ён захаваць ананімнасць) з Варшавы. Нядаўна фундатар разам са сваёй жонкай наведалі Гайнаўскі белліцэй і спаткаліся са стыпендыяткай. Барбара Андрасюк ангажуецца ў пазаўрочную дзейнасць школы і асяроддзя. Займаецца ў іканапісным гуртку, які дзейнічае ў белліцэі і спявае ў Маладзёжным царкоўным хоры пры Свята-Троіцкім саборы. Класны выхавацель стыпендыяткі Ядвіга Дамброўская хваліць вучаніцу за вялікую асабістую культуру і поспехі ў вучобе. Барбара Андрасюк стала фіналісткай Праваслаўнай алімпіяды рэлігійных ведаў. У будучыні хоча штудзіраваць нямецкую філалогію.

— Мы перакананы, што вучні апошніх класаў сярэдніх школ уяўляюць сваю будучыню. Часта складаныя матэрыяльныя ўмовы знеахвочваюць да дадатковай навукі. Тады цяжка здаць уступныя экзамены ў вышэйшыя ўстановы. За стыпендыі вучні могуць купляць неабходныя падручнікі і папаўняць свае веды на платных занятках. Важны таксама псіхалагічны аспект. Вучні пачынаюць разумець, што могуць разлічваць на дапамогу іншых асоб, — заяўляе спадар М. С. — Паколькі я праваслаўны па веравызнанні і выводжуся з беларускай сям'і, хачу дапамагчы праваслаўнай беларускай інтэлігенцыі. Я ведаю, што мая ініцыятыва адзінокая і ў агульнаграмадскім вымярэнні яе значэнне невялікае. Хацеў бы я сустрэць некалькі асоб, адданых гэтай справе, каб супольна дзейнічаць у карысць прапагандавання ідэі падтрымкі іншым. Можна было б шукаць спонсараў у краіне і за мяжою.

Спадар М. С. і яго жонка А. С. нарадзіліся на ўсходняй сцяне Рэчы Паспалітай і з дзяцінства хацелі вырвацца ў шырокі свет. Ведалі, што дарогай да гэтага будзе адукацыя і таму многа ўвагі адводзілі вучобе. Было многа фінансавых складанасцей, пакуль спадарыня А. С. атрымала вышэйшую адукацыю. Работа ў Варшаве дала ёй магчымасць выязджаць за мяжу. У спадара М. С. была складаная маладосць. Быў ён вывезены ў Сібір, а потым перайшоў баявы шлях з-пад Леніна да Берліна ў змаганні з нямецкім акупантам. У 1950 годзе выйшаў з войска, закончыў будаўнічы тэхнікум і політэхнічны інстытут. Працаваў на вялікіх прамысловых будовах, а пазней у дзяржаўнай адміністрацыі і таксама многа выязджаў за мяжу. Гэта асабістыя дасведчанні і назіранне за жыццём моладзі з бедных асяроддзяў выклікалі ў спадарства С. перакананне, што трэба дапамагаць іншым.

— Заўважылі мы з жонкай ялавасць жыцця на пенсіі, якое найчасцей накіраванае на заспакаенне ўласных патрэб. Адчулі патрэбу даваць дапамогу бліжнім. Дайшлі да вываду, што і на гэтым этапе жыцця варта нешта даць грамадству, пакінуць нейкія станоўчыя вартасці сярод людзей і добрыя ўспаміны аб сабе. Думаем, што стыпендыяткі будуць нас добра ўспамінаць, — кажа М. С.

— Гонар для нас, калі фундатары выбіраюць нашую школу. Аднак самая важная дапамога для канкрэтных вучняў, якія патрабуюць матэрыяльнай падтрымкі. Супрацоўніцтва са спадаром М. С. складваецца вельмі добра і наведвае ён наш ліцэй, — гаворыць дырэктар Яўген Сачко.

Аляксей Мароз

Інтэрвенцыйныя працы

Канчаюцца дамовы на працу інтэрвенцыйным працаўнікам у Арлянскай гміне; працавала разам 9 чалавек, у іх ліку адзін у бюро. Работнікі выконвалі розныя працы: ачышчалі абочыны дарог (у Вульцы-Выгаеўскай і Тапчыкалах), працавалі пры рамонтах святліц (у Шарнях, Тапчыкалах і Міклашах — ладзілі печкі, ды ў Рудутах — засцерагальныя працы). Былі выкананы бетонныя пратокі на дарогах, а ў Шчытах-Дзенцялове навезены шлак на даязную дарогу ў поле.

На тэрыторыі гміны праведзена была акцыя абмену непрыгодных вадамераў у хатах, а там, дзе іх не было, пастаўлены новыя (за кошт гміны). Вада ў гміне каштуе 1,18 злота за кубічны метр.

У кастрычніку інтэрвенцыйныя работнікі працавалі пры добраўпарадкаванні нямецкіх могілак перыяду першай сусветнай вайны ў Рыгораўцах; у будучыні могілкі будуць абведзены жалезным плотам. У Рыгораўцах і на савецкіх могілках у Орлі будуць устаноўлены мемарыяльныя табліцы.

Дамова з Падляшскай ваяводскай управай прадбачвае зварот гміне 8,5 тысяч злотаў.

Міхал Мінцэвіч

Пакаленне вайны

Толькі што прачытаў я чарнавік зборніка ўспамінаў беларусаў Беласточчыны пра перыяд II сусветнай вайны. Успаміны гэтыя павінны паказацца праз месяц у кніжным выданні Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва". Гэта запіс фактаў, якія запамяталіся жыхарамі нашых вёсак і мястэчак. У 1939-1944 гадах у большасці былі яны дзяцьмі або падлеткамі. Іх бачанне свету фарміравалася ў час, калі чалавечае жыццё стала вельмі танным. Смерць, злачынства, страх, роспач спадарожнічалі тады пастаянна людзям, якіх гналі ў рады чужых армій, у савецкія і нямецкія канцлагеры, саджалі ў турмы, вывозілі на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Тысячы людзей загінула падчас масавых расстрэлаў. Часта немцы забівалі зусім невінаватых людзей толькі таму, што сусед-даносчык абвінавацiў, напрыклад, у прыхільнасці да камунізму.

1 верасня 1939 г. пачалася вайна — пачатак кашмару, які ў выпадку беларускага насельніцтва Беласточчыны, цягнуўся амаль 10 гадоў. Разам з канцом вайны ў 1944 г. не спыніліся на гэтай зямлі злачынствы. Гарэлі беларускія вёскі, а да мірных людзей у некаторых мясцовасцях стралялі часцей чым падчас нямецкай акупацыі.

У другой палове верасня 1939 г. Беласточчына ўвайшла ў састаў Савецкай Беларусі. „Рускія" салдаты, якіх пабачылі людзі, выклікалі спачуванне. Выглядалі яны вельмі бедна, некаторыя былі апрануты ў парваныя уніформы. З большасці ўспамінаў вынікае, што беларусы іх чакалі як „сваіх", і „рускіх". Палякі, здаецца, зрабілі ўсё, каб усе надзеі беларусаў накіраваць на ўсход. Выглядае на тое, што людзі сапраўды чакалі якіх-небудзь змен і сапраўды ставілі трыумфальныя аркі для прывітання савецкага войска.

Пасля прыйшлі расчараванні. Руская ўлада, якая з'явілася тут у 1939 годзе, не была такой, якой людзі чакалі. Рэлігійная палітыка, калектывізацыя, шарваркі, планы, дурната засланых сюды савецкіх чыноўнікаў прымушалі мяняць погляды таксама нашых рэспандэнтаў.

Большасць аўтараў успамінаў падкрэслівае, што ўпершыню ў жыцці пачалі вучыцца на роднай мове. Такое прынамсі атрымалася ў людзей уражанне, таму што часта ў беларускай школе навучанне вялося на рускай мове. У адпаведнасці з савецкім заканадаўствам школьніцтва ў памеры сямі класаў падставовай школы было бясплатнае і абавязковае. У сувязі з гэтым савецкія школы наведвала на 25% дзяцей больш, чым польскія асветныя ўстановы да 1939 г.

Пачатак нямецка-савецкай вайны запамятаўся беларусам Беласточчыны як бліскучая перамога нямецкіх войскаў. Рускія не адступалі, але ўцякалі панічна і бязладна. Шмат хто з салдат не паспеў забрацца на ўсход, астаўшыся ў акупаванай немцамі зоне.

Немцы, якія прыйшлі на Беласточчыну ў чэрвені 1941 г., нічым не напаміналі тых, якіх людзі запамяталі ў пачатку верасня 1939 г., калі з'явіліся тут змагаючыся з польскім войскам. Тады беларускі люд быў „гут", цяпер стаў часткай варожай супольнасці. З першых дзён акупацыі пачаліся расстрэлы найбольш актыўных прадстаўнікоў грамадскасці. Нехта рабіў немцам спіскі, паводле якіх спецгрупы паліцыі знішчалі найчасцей невінаватых людзей. У Нарве рабіў гэта войт, даваенны чыноўнік. Па яго віне, як успамінае адзін з жыхароў, загінула каля сарака беларусаў. Падобныя сітуацыі апісалі жыхары Лазняў, Копнай Гары і іншых мясцовасцей. Беларусы па сёняшні дзень задумоўваюцца, хто быў больш вінаваты, ці тыя эсэсаўцы, што стралялі, ці забойцамі з'яўляюцца тыя, што пісалі даносы на сваіх суседзяў, часта толькі таму, што былі іншага веравызнання.

Калі чытаецца дзесяткі ўспамінаў людзей пакалення вайны, відаць як іх лёс быў да сябе падобны. Большасць выступала ў ролі зацкаванай звярыны. Уцякалі, хаваліся, былі бітымі, сталі сведкамі забойстваў, ці прыніжэння найбліжэйшых ім людзей. Жанчына з Бельска-Падляшскага ўспамінае гісторыю, пра якую па сёняшні дзень не ўспамінаецца ў яе сямейным асяроддзі. Выклікае яна надта вялікі боль і адкрывае свежыя раны ў душы.

Для большасці рэспандэнтаў дзесьці перад вачамі стаіць вобраз няшчасных яўрэяў, прыгавораных фашыстамі на знішчэнне. Жылі яны побач беларусаў і раптам нехта загадаў пазбавіць іх жыцця. Нават з запісаных беларускімі сялянамі лісткоў адчуваецца роспач яўрэяў, шукаючых паратунку не для сябе, а толькі для сваіх дзяцей. Адчуваецца таксама стан душы аўтараў успамінаў, якія вымушаны былі адмовіцца ратаваць яўрэйскія дзеці са страху за лёс сваіх. Кожны меў свядомасць, што ў асяроддзі, у якім пражывае, заўсёды знойдзецца нехта, хто падкажа немцам парушаючых заканадаўства суседзяў. Кожны таксама ведаў, якія паслядоўнасці чакаюць за парушэнне заканадаўства і за дапамогу жыдам. У 1943 г. яўрэяў на Беласточчыне ўжо не было.

На старонках кніжкі, якая неўзабаве выйдзе друкам, не будзе відаць змагароў і герояў, а толькі звычайных людзей, ахвяр палітыкі акупанта, нікчэмнасці такіх самых як яны звычайных людзей, якія са страху ці для выгады здзяйснялі злачынствы. А ў справе жыдоў у выказваннях аўтараў успамінаў адчуваецца паміж фразамі непастаўленае пытанне: ці можна нешта было зрабіць для іх выратавання? Вядома толькі, што адказу на гэтае пытанне ніколі не будзе.

Шмат увагі ўспамінаючыя адводзілі партызанскаму руху. Са змешчаных выказванняў відаць, што не ўспрымаўся ён адназначна. Часта, як напрыклад паводле жыхаркі Старога Ляўкова, партызанаў людзі атаясамлівалі з бандытамі, якія рабавалі сялян, праследавалі, сваёй дзейнасцю наводзілі жахлівыя рэпрэсіі з боку немцаў. Шмат хто прызнаецца, што добраахвотна карміў падпольшчыкаў, ці быў іх інфарматарам. З выказванняў беларусаў Беласточчыны вынікае, што ў асноўным падпольны рух стваралі былыя савецкія вайскоўцы, якія не паспелі ўцячы на ўсход летам 1941 г. У лесе апынуліся таксама мясцовыя людзі, якія былі ў бязвыхаднай сітуацыі. Недзе ў пушчы хаваліся таксама польскія збройныя групоўкі. Усе яны жылі за кошт мясцовага сялянства, найчасцей гвалтам адбіраючы харчы, вопратку і ўсё астатняе. Немцы часам каралі нават за вымушаную дапамогу. Амаль ва ўсіх кутках Беласточчыны акупанты выкарыстоўвалі рускамоўных правакатараў, найчасцей савецкіх ваеннапалонных, якія прыкідваліся прадстаўнікамі падпольнага руху, а пасля ў нямецкіх уніформах забівалі даверлівых дабрадзеяў.

Прачытаўшы ваенныя ўспаміны жыхароў „спакойнай" Беласточчыны, у галаву ціснецца пытанне: за што людзі людзям учынілі такі кашмар? Але, здаецца, гэта адвечнае пытанне, на якое яшчэ ніхто не даў адказу.

Яўген Міранові ч

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Орля — пераможцы

Турнір — радасць і слёзы!

Здавалася б, няма сілы перамагчы бельскую „тройку”. Тут, сярод паўтысячы гімназістаў, можна выбраць каманду, якая будзе прадстаўляць краіну! А з такога Беластока ці Гарадка прыехалі амаль усе навучэнцы з беларускай гімназіі. Таму поспех Олі быў для нас сюрпрызам.

У неспартыўнай частцы ўсе ўдзельнікі дасягнулі высокай ацэнкі. Зараз прыводзім месцы і колькасць балаў, дзе ярка відаць ваша заангажаванне і прагу перамогі. Многа балаў прапала з-за дрэннай акустыкі і тут, як на злосць, найбольш страцілі гаспадары.

Другім кручком быў час — камісія дакарала за перасяканне часу ў конкурсе на легенду!

Цікава атрымоўваецца параўнанне — ніжэй прыводзім вынікі і колькасць балаў без спорту і толькі ў спорце. Як відаць, чарговасць у спроце амаль такая ж, што і агульная (знойдзеце яе ў артыкуле „Сланам у народных кашулях”).

Спартыўныя канкурэнцыі (максімальная колькасць балаў — 40)

I месца — Орля — 38 балаў,
II месца — Бельск-Падляшскі — 32,5,
III месца — Нараўка — 25,5,
IV месца — Гайнаўка — 22,
V месца — Дубічы-Царкоўныя — 20,5,
VI месца — Аўгустова, Кляшчэлі — 19,5,
VII месца — Беласток — 15,
VIII месца — Гайнаўка н-р 2 — 14,5,
IX месца — Гарадок — 13.

Неспартыўная частка (максімальная колькасць балаў — 60)

I месца — Бельск-Падляшскі, Гайнаўка н-р 2 — 56 балаў,
II месца — Беласток, Орля — 55,
III месца — Гайнаўка — 54,
IV месца — Нараўка — 53,
V месца — Гарадок, Дубічы-Царкоўныя — 52,
VI месца — Аўгустова — 48,
VII месца — Кляшчэлі — 43.

У наступных нумарах „Зоркі” напішам пра нештодзённыя каманды і паспрабуем прыблізіць спартыўныя гульні — пікер, дрындушкі, каменьчыкі — якія так выдатна ажывілі турнір.

ЗОРКА

Авяр’ян ДЗЕРУЖЫНСКІ

Снежань

Снежань кружыць,
І скуголіць.
І з мяцеліцай
Сваволіць,
Мяккі снег
Бярэ ў ахапкі,
Беліць елак,
Сосен шапкі.
Толькі Янка не зважае,
Снег ён
Скруткамі качае,
„Бабу” лепіць
На двары,
Дзе сабраліся
Сябры.
Снежань
З веямі ідзе,
Нам нясе
Кароткі дзень.

Вершы Віктара Шведа

Патрэбны ветэрынар

Зажартаваў сабе лекар,
Зрабіў з пацыента здзекі:
— Сэрца — як у каня,
Сіла — як у слана.

Пацешу цябе я навінаю:
Здароўе маеш бычынае.
Куды ты збіраешся зараз?
— Іду я да ветэрынара.

Аляксандра

Оля Лаўранюк ўжо ў гімназіі, але калі яна выступала ў Нараўцы, на Цэнтральным конкурсе „Роднае слова 2003”, прадстаўляла яшчэ Пачатковую школу н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

Выступленне Аляксандры вылучылася падборкай твора і ўражлівым пераказам зместу. Оля дэкламавала верш Яўгеніі Янішчыц „Пачынаецца ўсё з любві”. Яўгенія Янішчыц — асаблівая паэтка. Яшчэ пры жыцці яна ўяўлялася як анеліца беларускай паэзіі. І зараз на яе магіле ў Мінску бачым скульптуру белага анёла. Здаецца, анёл паэткі дапамагаў Олі — яна стала лаўрэаткай трэцяга месца.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Насценгазета

На старой сцяне ў бабулінай „каморцы” — некалькі слояў шпалераў. Тая каморка — невялікі пакойчык, складзік, у якім складваліся розныя рэчы — новавытканыя радзюжкі і дываны, звалькі палатна, парожнія кадушкі і бочкі, капанькі, у якіх ужо не купалі дзяцей, бо ўжо даўно павырасталі і пайшлі ў свет... Стаяў там таксама стары ложак са шчыткамі з намаляванай парай лебедзяў на блакітнай вадзе, дзюба ў дзюбу. На ложку ляжала пасцель, якую баба Надзя час ад часу ўсе тыя гады выносіла на двор пры сонечным надвор’і, развешвала на платы, узбівала падушкі і пярыны. Гэты ложак — для таго, хто прыедзе ў госці, а не хопіць яму месца „на вялікай хаце” альбо ў спальнях. А ёсць такія сваякі бабы Надзі і дзеда Антося, што, прыехаўшы, жадаюць спаць якраз у каморцы, прапахлай зеллем, чорнымі ягадамі, баравікамі, старой сухой драўнінай. Гэта якраз любяць Зося і Караль, унукі з Беластока. Асабліва ноччу там цікава, таемна. А раніцай можна глядзець таксама на сцены — на іх з-пад шпалераў выходзяць старыя карціны. Ды пра тыя „карціны” бабе Надзі і не кажы: даўно трэба ў каморцы зрабіць рамонт. Сарваць паперу, ачысціць, а сцены абабіць дошкамі ці панеллю. Гэтак модна.

Сталі ўнукі памагаць зрываць шпалеры. А там — пад адным слоем — другі, трэці, чацвёрты... Пажоўклыя, пасівелыя... А на самым пачатку, на голай сцяне — газеты.

— Бабця, а хто гэта такі? — стаў узірацца Караль на два партрэты, выра-

Экскурсія ў Студзіводы

Дарагая Рэдакцыя!

Мы, вучні Гімназіі ў Дубінах, хочам Табе расказаць аб паездцы ў Студзіводы. 9 кастрычніка 2003 г. гімназісты першых і трэціх класаў паехалі на экскурсію ў Студзіводы. Гэта невялікая мясцовасць у бельскім павеце.

Школьны аўтобус прывёз экскурсантаў да хаты-музея „Малой Айчыны" ў Студзіводах. Прывітаў нас яе ўласнік Дарафей Фіёнік. На пачатку расказаў ён гісторыю Студзіводаў, як асяродка валення. Паказаў таксама валёнкі і працэс іх вырабу. Пасля вучні глядзелі здымкі, якія адлюстроўвалі вёску Студзіводы і яе жыхароў. Затым Дарафей Фіёнік павёў экскурсантаў у кухню-музей, у якой пабачылі мы многа цікавых прадметаў, між іншым, павука з саломы і бібулы. Ён нам вельмі спадабаўся. Убачылі яшчэ кросны, колішні посуд, ложак, гліняную печ. Дарафей Фіёнік распавёў нам пра гісторыю розных вёсак, у тым ліку і нашых родных мясцовасцей. Некаторыя вучні даведаліся многа цікавых інфармацый аб сваёй вёсцы.

На экскурсію мы паехалі са сваімі настаўніцамі: Нінай Куптэль, Валянцінай Касцевіч і Галінай Парфянюк. Усе мы атрымалі беларускія кніжачкі, якія прадстаўляюць багатую гісторыю Бельска-Падляшскага. У іх апісаны абрады і культура горада. Ад цікавага ўрока гісторыі засталіся памятныя здымкі.

Потым усе паехалі на супольнае вогнішча, якое падрыхтаваў нам раней спадар Дарафей Фіёнік. Гэтая экскурсія адбылася дзякуючы фінансавай падтрымцы Цэнтра грамадзянскай адукацыі „Польшча-Беларусь".

Вучні і настаўнікі Публічнай гімназіі ў Дубінах

Д. Фіёнік з вучнямі ў сваёй хаце-музеі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Руіны Навагрудскага замка

Замкі Беларусі

Як думаеце, чаму найбольш захаваных замкаў знаходзіцца ў паўночна-заходняй частцы Беларусі?

Адказ просты. Пачынаючы з XIII стагоддзя, менавіта з гэтага боку наязджалі заходнія рыцары — крыжаносцы. Каб адперці варожыя навалы, князі, на нямецкі ўзор, будавалі магутныя крэпасці, замкі.

Напэўна многія з вас ведаюць славуты замак у Навагрудку. У Польшчы — за справай паэта Адама Міцкевіча, у Беларусі — месца расславіў паэт і празаік Уладзімір Караткевіч. Старажытныя руіны і звязаныя з імі легенды натхнілі нашых творцаў.

Навагрудскі замак існаваў у XI-XVI стагоддзях. Падзяляўся ён на дзве часткі — на г.зв. замак на дзядзінцы і малы замак. Зараз захаваліся толькі фрагменты вежы і абарончага мура. Караткевіч прадставіў іх як „зуб каменнай пачвары", што тырчыць з-пад зямлі.

Навагрудак быў першай сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Археолагі знайшлі тут многа каштоўных прылад і прадметаў штодзённага побыту. Паводле іх, мяркуецца, горад і яго жыхары жылі ў багацці і заможнасці.

На канец — традыцыйна ўжо — пытанне: **Які беларускі літаратар пісаў пра Навагрудскі замак? Назавіце твор (тут можна прывесці шэраг прыкладаў).**

ЗОРКА

Адказ на пытанне ў „Зорцы" н-р 46: Замак у Нясвіжы належаў княжацкаму роду Радзівілаў. Радзівілы мелі замкі і палацы ў многіх мясцінах Беларусі і Польшчы, але іх сямейным гняздом лічыцца замак у Нясвіжы.

Узнагароды — **Легенды-маляванкі і італьянскія каляровыя алоўкі** — выйграла **Анна Раманюк** са Старога Беразова. Віншуем.

Мы з-за Буга

Да лекара прыходзіць матка
Са сваім малым дзіцяткам.
Дзіця даўжэйшы час хварэе,
У лекары адна надзея.

Лекар з пытаннем падыходзіць:
— Ці одру ваш сынок праходзіў?
— Не, не праходзіў наш нядуга,
Бо, пане доктар, мы з-за Буга.

Віктар Швед

Танька-гультайка

Была ў бабулі ўнучка-гультайка! Аб чым яе ні папросіш, нічога не зробіць.

Аднойчы бабуля папрасіла Таню схадзіць па хлеб, але ўнучка сказала:

— Я схадзіла б, але мае ножкі не хочуць ісці.

— Добра, — сказала бабуля, — я сама схаджу. А пакуль я буду ў краме, ты памый шклянкі.

— Я памыла б, але мае рукі не хочуць мыць.

Бабуля выйшла. І тут здарылася нешта неверагоднае. Таніны ножкі пачалі раптам танцаваць, а рукі ім дапамагаць. Яны раз за разам узмахвалі, як птушкі крыламі, насілі па пакоі. Дзяўчынка нічога не магла зрабіць. Ні з нагамі, ні з рукамі. Стамілася, пачалі прасіцца:

— Ручкі вы мае, ножкі вы мае, я так больш не буду. Я буду вельмі паслухмянай дзяўчынкай, ніколі не пакрыўджу бабулю.

Неўзабаве вярнулася бабуля з крамы. Урадаваная ўнучка падбегла да яе:

— Бабулечка! Я буду ў цябе самай-самай лепшай унучкай, ніколі больш не буду гультайкай!

Усміхнулася бабуля, сказала ласкава:

— Я хацела купіць табе цукерак, але падумала што твае ручкі не захочуць іх браць. Цяпер жа бачу, што твае ножкі самі сходзяць па цукеркі ў краму.

Раман Раманенка, Мінская вобласць, Любанскі раён, г.п. Урэчча

заныя з газеты, наклееныя адзін ля аднаго. Маладыя дзядзькі ўсміхаліся роўнымі зубамі. Партрэты захаваліся, быццам былі наклеены толькі ўчора.

— Гэта Юігагаі! — засмяялася бабуля. — А гэты — Джон Кенедзі.

— Гэты быў прэзідэнтам Амерыкі, — чула пра яго Зося. — А „Юігагаі"?

Бабуля аж пакацілася ад смеху на ложак.

— А гэтак назваў яго ваш тата, калі маленькі быў. Якраз паляцеў Юрый Гагарын у космас. Хадзіў ваш тата, трымаючы кашулю, так сказаць, у зубах, глядзеў на партрэт, і цешыўся: „Юігагаі, Юігагаі". Харошыя былі хлопцы, дык я іх і наклеіла, каб каморку прыхарашылі!

— Такую, вось, ты, бабуля, хроніку зрабіла на сценах! — засмяяўся Караль. — І сусветная памятка, і сямейная!

Міра Лукша

Польска-беларуская крыжаванка № 48

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 44: Яда, бот, сом, калодзеж, дуда, дарога. Яр, сад, жолуб, мода, дар, абоз, стужка.

Узнагароды — **аўтаручкі** — выйгралі: **Агнешка Семянюк**, **Дар'я Антанюк** і **Аня Рубашэўская** з Бельска-Падляшскага, **Дамініка Каліноўская** і **Іаанна Казёл** з Гарадка, **Аня Раманюк** са Старога Беразова, **Паўліна Чурак** з Арэшкава. Віншуем!

Фота з архіва ГАК у Орлі

Культура ў Орлі

Дзейнасць Гміннага асяродка культуры ў Орлі ў вялікай ступені прымяркоўваецца да актыўнасці моладзі і да прамоцыі гміны.

Арлянскі ГАК займае цесныя памяшканні будынка, узведзенага ў гаспадарчых мэтах у час рамонту сінагогі ў 80-х гадах. Сёлета прыдбалі два дадатковыя памяшканні, якія раней займаў камісарыят паліцыі, адрамантавалі іх, абсталявалі мэбляй ды газавай і мікрахвалевай печкамі і цяпер там вядуцца кулінарныя заняткі з дзецьмі; мэблю і тэлефонны апарат спісала сюды Канцылярыя Сейма Рэчы Паспалітай.

У ГАК на поўным штаце працуе дырэктар Аліцыя Собунь. Ад чатырнаццаці гадоў працуюць тут таксама музычныя інструктары з Беларусі — цяпер Мікалай Фадзін, выкладчык мастацкай вучэльні з Гродна; ягоная жонка Людміла працуе харэографам калектыву „Арляне". У рамках захавання мясцовага фальклору і народнай традыцыі Асяродак супрацоўнічае з Галоўным праўленнем Беларускага грамадска-культурнага таварыства і ладзіць кантакты з калектывамі з Беларусі.

Флагманскімі культурнымі мерапрыемствамі ў Арлянскай гміне з'яўляюцца Сямейны пікнік, ладжаны Беластоцкім радыёвяшчаннем у маі, беларускі фэст у ліпені ды вераснёвыя Арлянскія сустрэчы з культурай і мастацтвам дзяцей і моладзі (сёлета ніводнае з гэтых мерапрыемстваў не адбылося).

Асяродак супрацоўнічае з Комплексам школ у Орлі, дабравольнымі пажарнымі камандамі ў Орлі і Маліннікам, арлянскай Гміннай бібліятэкай ды з асяродкамі сельскагаспадарчай кансультацыі ў Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы. У рамках культурнага абмену арлянскі ГАК супрацоўнічае з ГАК у Боцьках і Гайнаўскім домам культуры. Наладжана супрацоўніцтва з гміннымі культурнымі ўстановамі ў Нараўцы, Чаромсе і Дубічах-Царкоўных, паспяхова складваецца супрацоўніцтва з Ваяводскім асяродкам анімацыі культуры ў Беластоку.

Гмінны асяродак культуры прапагандуе таксама народную творчасць. Супольна з Управай гміны і асяродкамі сельскагаспадарчай кансультацыі ў Бельску і Шэпятове дабіваецца прэзентацыі народнага рукадзелля на выстаўках, м.інш. на міжнароднай канферэнцыі краін Еўрасаюза ў Варшаве, сельскагаспадарчым кірмашы ў Кракаве, ваяводскім свяце ўраджаю ў Драгічыне.

Пры Гмінным асяродку культуры дзейнічаюць фальклорны калектыў „Арляне", калектыў аўтэнтычнага фальклору „Малінкі" з Маліннік, дзіцячы беларускі калектыў песні і танца, вакальна-тэатральны калектыў „Dzieci Pana Kleksa" ды дзіцячы мастацкі кружок. Сёлета сваю дзейнасць закончыў маладзёжны музычны калектыў „Co Jest Grane", а на яго месцы навукай ігры на музычных інструментах занялося яшчэ малодшае пакаленне. Дзейнічае там таксама маладзёжны клуб „BezA", члены якога прапагандуюць здаровае, безалкагольнае праводжанне вольнага часу.

„Арляне" (на здымку) з'яўляюцца падляшскім мастацкім даўгавечнікам. У сваім рэпертуары маюць беларускія народныя песні, глыбока ўкаранелыя на арлянскай зямлі, беларускі апрацаваны фальклор і творы сучасных беларускіх кампазітараў. Цяжка паверыць, але гэты калектыў існуе ўжо 57 гадоў! З ліку дасягненняў — толькі за апошнія гады — трэба згадаць, м.інш. галоўны прыз Агульнапольскага фестывалю „Беларуская песня" ў 1998 годзе ды выступленні ў многіх гарадах Польшчы і замежжа. У 2002 годзе „Арляне" занялі II месца ў IV Прэзентацыях народнай традыцыі Падляшскага ваяводства, а ў гэтым — 2003 годзе, — I месца ў Ваяводскім аглядзе мастацкіх калектываў „Сеніярада-2003", набываючы права прадстаўляць Падляшша ў агульнапольскім аглядзе. Члены калектыву паспяхова прымаюць удзел у конкурсах квартэтаў, дуэтаў і салістаў. На сённяшні дзень у калектыве галоўным чынам выступаюць пенсіянеры: Фёдар Аўдзіевіч (ветэран-пачынальнік), Марыя Адзіевіч, Ніна Шыманская, Вольга Данілюк, Яўгенія Хаміцкая, Яўгенія Хмялеўская, Ніна Гаўзэ, Зінаіда Навіцкая, Людміла Фадзін, Валянціна Арэшук, Уладзіслаў Камарчук, Яўген Бала.

Радуе тое, што ад нейкай пары гаворыцца ў Орлі пра вырастанне наступнікаў „Арлян" — гэта дзіцячы вакальна-танцавальны калектыў, які паспяхова дзейнічае ўжо другі год. Першае выступленне калектыў даў у школе восенню 2001 года, а ў 2002 годзе яго выступленне ў час Сямейнага пікніка суправаджалі гарачыя авацыі арлянскай публікі. Сёння ў калектыве займаецца дзесяць дзяўчынак і трох хлопчыкаў ва ўзросце ад 7 да 13 гадоў. Найбольшымі дасягненнямі калектыву былі: II месца ў Агульнапольскім конкурсе беларускай песні сярод пачатковых школ, II месца дзявочага дуэта і III месца сярод салістаў Наталлі Міранчук — у 2002 годзе ды III месца салісткі Эдыты Русіновіч у сёлетнім Агульнапольскім конкурсе беларускай песні ў катэгорыі пачатковых школ.

Эдыта Русіновіч паспяхова выступае і ў другім калектыве — вакальна-тэатральным „Dzieci Pana Kleksa", які з мінулага года вядзе дырэктар ГАК Аліцыя Собунь. Калектыў налічвае каля дваццаці дзяцей, якія спяваюць, гуляюць у тэатр і дэкламуюць вершы. У мінулым годзе Эдыта Русіновіч заняла I месца ў дэкламатарскім конкурсе „Трыгалас" у Бельску-Падляшскім, а сёлета — II месца ў ваяводскіх спаборніцтвах „Baje, bajki, bajeczki".

Арлянскі Гмінны асяродак культуры праводзіць таксама „Wakacje z GOK" і „Ferie zimowe z GOK". З 1998 года ладзяцца „Wigilie dla samotnych", ініцыятарам якіх быў аўтар гэтых радкоў.

Апрача Гміннага асяродка культуры на тэрыторыі гміны існуе 9 вясковых святліц: у Чахах-Забалотных, Дыдулях, Міклашах, Москаўцах, Кашалях, Пашкоўшчыне, Шарнях, Спічках і Тапчыкалах; у ніводнай з іх няма штатных працаўнікоў. Ёсць таксама 9 пажарных дэпо, якія выконваюць святлічныя функцыі. У 2002-2003 гг. адрамантавалі 7 святліц. Кожны год у выбраных святліцах або дэпо адбываюцца народныя фэсты або канцэрты мастацкіх калектываў.

* * *

Нядаўна Управа Арлянскай гміны падала ў Ваяводскі асяродак інфарматыкі заяўку аб прыступленні да праекта „Ікона", які прадбачвае арганізацыю інтэрнэтавых кафейняў у малых мясцовасцях дзеля карыстання імі моладдзю і дарослымі. У Орлі, калі ўдасца, кафейня мае быць у ГАК.

Міхал Мінцэвіч

На сцэне БГКТ

Вялікім зацікаўленнем беластачан карыстаюцца выступленні аматарскіх мастацкіх калектываў, якія паказваюць беларускія вясковыя абрады.

25 кастрычніка ў Беластоку гасцявалі чатыры самадзейныя калектывы: „Рэчанька" з Козлікаў пад кіраўніцтвам Любы Гаўрылюк, „Малінкі" з Маліннікаў пад кіраўніцтвам Аліцыі Собунь — дырэктара Гміннага асяродка культуры ў Орлі, „Арэшкі" з Арэшкава пад кіраўніцтвам Надзеі Грушэўскай і „Красуні" з Краснага Сяла пад мастацкім кіраўніцтвам Валянціны Марціновіч.

Забалеў жывот

„Рэчанька" прадстаўляла колішнія вячоркі. Сабраліся жанчыны вечарам са сваімі работамі, пераважна з вязаннем на прутках і вышыўкай, працавалі і адначасна спявалі. Але настрой усім сапсаваў гаспадар хаты. Яму страшэнна забалеў жывот. Пачалі лячыць яго жанчыны, адна замовамі, другая — чарамі. Урэшце паставілі яму збанок на жывот. І зноў бяда. Жывот хворага ўцягнула ў збанок. Хапілі яго яшчэ большыя болі. Зняць збанок жанчыны не маглі і прыйшлося разбіць яго. Прысутныя ў зале рагаталі, гледзячы на падзеі няўдалых вячоркаў.

Адведкі

— А які прыгожанькі, а які вялікі ўнучак, — захапляецца бабуля, люляючы яго ў калысцы. А каб дзіцятка не плакала і не хварэла, перавязалі яго чырвонай стужкай. Парадуха ўключаецца ў размову і разам са свякрухай рыхтуюць пачастунак наведаўшым гасцям, якія таксама не прыйшлі з пустымі рукамі. Усе разам прыгожа пяюць, перакульваючы чарку за шчасце нованароджанага. Сцэнка і песні былі добра падрыхтаваны „Малінкамі" з Маліннік.

Шаткаванне капусты

„Красуні" паказалі, як яшчэ не ў так далёкім мінулым шаткавалі капусту. Асабліва смешнымі былі хвіліны, калі жанчыны мылі мужчыну ногі, які ўлезшы ў кадушачку ўтоптваў капусту. А пасля гэтай капустай закусвалі, выпіваўшы чарку самагонкі. Вядома, гэтай сцэнцы спадарожнічала беларуская народная песня. Гурт „Красуні" не мае штатнага мастацкага кіраўніка. Ролю гэту выконвае самародны вясковы талент у асобе Валянціны Марціновіч.

А муж п'яніца

Таксама як „Красуні", гурт „Арэшкі" з Арэшкава (Гайнаўскі павет) не мае штатнага спецыяліста. З абавязкамі мастацкага кіраўніка спраўляецца таленавітая Надзея Грушэўская. Аб ліхой долі жанчыны, якая выйшла замуж за п'яніцу, распавядала падрыхтаваная калектывам сцэнка і народныя песні.

* * *

7 лістапада на сцэне БГКТ выступілі абрадавыя калектывы — „Крыніца" з Беластока і „Чыжавяне" з Чыжоў, што ў Гайнаўскім павеце. „Крыніца" выступіла са сцэнкай „Адведкі" і песенным рэпертуарам. „Чыжавяне" прадставілі абрад „Агледзінаў". Бацькі з дачкою, да якой пасватаўся малады чалавек, прыехалі паглядзець заможнасць маладога. Яны сустракаюцца з сардэчным прыёмам бацькоў жаніха. Гурт паказаў свае песенныя здольнасці.

Перапоўненая гледачамі зала жыва рэагавала на ўсе выступленні самадзейнікаў, узнагароджваючы іх апладысментамі.

Міхась Хмялеўскі

Гміна з доўгажыхарамі

У Нараўчанскай гміне пражывае 4 600 чалавек. Найбольшыя вёскі: Нараўка, Семяноўка, Старое ды Новае Ляўкова, Скупава, Міклашэва, Плянта, Альхоўка і Лешукі. Дваццаць гадоў таму на тэрыторыі гміны пражывала 6 570 чалавек. Зараз у Нараўчанскай гміне больш людзей памірае чым нараджаецца. У 2002 годзе нарадзілася 23 дзяцей, а памерла ажно 80 чалавек. Гэтаксама і сёлета — нарадзілася 13 дзяўчынак і 11 хлопчыкаў. На працягу 1993-2003 гадоў павялічыўся толькі лік жыхароў Нараўкі — з 962 на 999. У іншых вёсках паменшаў, найбольш у Семяноўцы, Старым Ляўкове, Скупаве і Міклашэве.

Сёлета ўшаноўвалася 19 пар, якія адзначылі 50 гадоў сумеснага жыцця.

Доўгажыхарамі Нараўчанскай гміны з'яўляюцца: 102-гадовая Фяўроння Стоцкая з Бярнацкага Моста, 100-гадовы Юзаф Шарэйка з Плянты і 100-гадовая Анна Кісялеўская са Стачка. Да сотні гадоў жыцця набліжаюцца Наталля Бірыцкая (нар. у 1904 г.) і Яўгенія Аліхвер (нар. у 1905 г.) — абедзве жыхаркі Семяноўкі. (яц)

Першыя крокі

Размова з Міраславам МОРДАНЕМ, старшынёю ўправы Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" і заадно намеснікам бурмістра Гайнаўкі.

— Новавыбраная ўправа Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" 23 кастрычніка 2003 года выбрала Вас сваім старшынёй. Якія будуць Вашы першыя крокі?

— Спачатку хачу дакладней пазнаёміцца з дзейнасцю музея. Трэба будзе займацца бягучымі справамі і парадкаваннем экспанатаў. Пасля трэба будзе здаваць у музейнае карыстанне ўсе будынкі і юрыдычна ўрэгуляваць справу ўласнасці зямлі, на якой стаяць музейныя будынкі. Зараз уласнікам зямлі з'яўляецца Галоўнае праўленне БГКТ, а будынкі належаць да Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы". Хачу давесці, каб сродкі на музейныя штаты былі з дзяржаўнага бюджэту або з бюджэту Ваяводскага сейміка. Будзем таксама парадкаваць тэрыторыю вакол музея і старацца адкрываць выстаўкі. Згодна з названнем — „Музей і асяродак беларускай культуры" — музейная дзейнасць будзе толькі адной з дзялянак дзейнасці асяродка беларускай культуры.

— У час з'езду гаварылася, што будзе выбраны дырэктар.

— Мая пасада і ўсіх іншых членаў управы грамадская. За нашу працу не будзем браць грошай. Кіраваць працай музея будзе дырэктар і ён будзе атрымліваць зарплату.

— Як будзе выбірацца новы дырэктар?

— У мінулым быў арганізаваны конкурс на пасаду дырэктара, аднак не закончыўся станоўчымі вырашэннямі. Зараз публічна інфармуем, што ўправа таварыства шукае кандыдата на дырэктара. Будзем выбіраць сярод асоб, якія да нас прыйдуць. Дырэктар мусіць быць добрым менеджэрам, які да пасобных дзялянак музейнай дзейнасці падбярэ сабе кампетэнтных працаўнікоў. Задачай яго будзе хадайніцтва перад рознымі фондамі за сродкі і таму павінен ведаць як весці сябе ва ўмовах рыначнай эканомікі. Дырэктар павінен ведаць беларускую мову і арыентавацца ў беларускай культуры. Хочам выбраць асобу, якая будзе добра спраўляцца з пастаўленымі задачамі. Гэта ўправу будуць разлічваць члены таварыства за рэзультаты працы.

— Як хочаце ўрэгуляваць уласнасць зямлі, на якой стаяць музейныя будынкі?

— На гэтую тэму мы яшчэ канкрэтна ва ўправе не размаўлялі, але будзем займацца гэтай справай у бліжэйшы час. Пасля будзем размаўляць аб гэтым з БГКТ.

— Якой дзейнасцю будзе займацца асяродак беларускай культуры?

— Будзе працаваць беларуская бібліятэка, будуць сустрэчы з цікавымі людзьмі на тэму беларускай культуры і гісторыі нашых зямель. Можа будуць дзейнічаць гурткі зацікаўленняў.

— Ці плануеце ладзіць супрацоўніцтва з беларускімі арганізацыямі?

— Хочам супрацоўнічаць з усімі беларускімі арганізацыямі. Асяродак мусіць быць адкрыты на супрацоўніцтва з мясцовымі і ваяводскім самаўрадамі.

— Можа беларускія арганізацыі схочуць наняць залу для сваёй дзейнасці. Ці будзе такая магчымасць?

— На гэтае пытанне зараз цяжка адказаць. Можна будзе вырашаць такія справы пасля перадачы будынкаў для музейнай дзейнасці. Тады будзе відаць, якія памяшканні будуць свабоднымі. Можа быць і так, што нават і ўстановы, якія цяпер арандуюць памяшканні, будуць вымушаны перанесці сваю дзейнасць у другое месца.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— Як прадбачваеце фінансаваць музейную дзейнасць?

— Штаты ва ўсіх музеях фінансуюцца дзяржавай або самаўрадамі. Мы будзем намагацца, каб грошы на штаты атрымаць ад дзяржавы або ваяводскага самаўрада.

— Ці не апасаецеся, што за грашыма могуць пайсці ўказанні і музей страціць беларускі характар?

— Думаю, што беларускага характару не страціць, бо не прадбачваем аддаваць музея на ўласнасць дзяржаве або самаўрадам. Ён будзе надалей грамадскім.

— А як плануеце фінансаваць музейную дзейнасць у бліжэйшы час?

— Дасюль музей карыстаўся даходамі ад арэнды памяшканняў, складчын і грантаў. У будучыні важнай крыніцай могуць стаць сродкі з фондаў Еўрасаюза. Да іх будзем выступаць з праектамі на музейную дзейнасць.

— Ці не разлічваеце на дапамогу з боку мясцовых самаўрадаў?

— Ёсць вялікая прыхільнасць мясцовых самаўрадаў да музея. Аднак сёння ў самаўрадаў фінансавыя цяжкасці і на вялікія сродкі ад іх нельга разлічваць. Больш спадзяемся на арганізацыйную дапамогу самаўрадаў.

— Ці ёсць канцэпцыя арганізавання пастаянных экспазіцый і музейнай дзейнасці?

— Гэтым будзе займацца дырэктар і людзі, якіх сабе падбярэ. Яны пераглянуць апрацаваныя праекты і вырашаць як далей будзе арганізавацца музейная дзейнасць.

— Зараз пастаўлю Вам пытанне як намесніку бурмістра горада Гайнаўка. Ці будзе дапамога музею з боку гарадскіх улад?

— Прыгожыя будынкі музея знаходзяцца ў цэнтры горада і гарадскія ўлады зацікаўлены яго дзейнасцю. Разважым як памагчы музею паводле нашых магчымасцей.

— Ці прадбачваеце надалей арганізаваць у музеі дзейнасць кіно?

— Так, хочам каб надалей у музеі працавала кіно. Карыстаючыся нагодай хацеў бы я падзякаваць усім, якія спрычыніліся да будовы музея. У сваёй працы на пасадзе старшыні ўправы буду старацца не падвесці асоб, якія мяне выбралі і рэалізаваць пастановы ўправы таварыства.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Першы дырэктар

Прэзідыум управы Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" 19 лістапада выбраў першага дырэктара музея. Стаў ім 34-гадовы інжынер-магістр Ян Карпюк з Рудут, які раней працаваў у музеі на пасадзе самастойнага захавальніка экспанатаў. Па адукацыі ён тэхнолаг драўніны па спецыяльнасці ахова і забеспячэнне. Апошнім часам працаваў менеджэрам у прадпрыемстве „Гальдрэў" у Рудутах, якое займаецца гандлем драўлянай галантарэяй. Быў ён адзіным кандыдатам, якога прэзідыуму прадставіў старшыня таварыства Міраслаў Мордань. (ам-з)

Каля старой іконы

Святкаванні ў гонар святога велікамучаніка Дзімітрыя Салунскага, якія адзначаліся 8 лістапада 2003 года ў Саках, сабралі шматлікіх паломнікаў. Хаця ў час усяночнага богаслужэння ў Саках было некалькі градусаў марозу, побач Дзімітрыеўскай царквы стаялі вернікі, якія не памесціліся ў сярэдзіне храма. Аднак сабраныя не разыходзіліся, чакаючы вынасу цудадзейнай іконы св. Дзімітрыя. Знаходзіцца яна ў алтары і выносіцца насярэдзіну царквы толькі адзін раз у год. Нават і каталікі з Сакоў прыйшлі прылажыцца да іконы. Лічаць яны, што жаўнер Вежба, які з Дзімітрыеўскай іконай быў перанесены з турэцкай няволі ў родную вёску Сакі, быў каталікам.

На наступны дзень, пасля асвячэння вады адслужаны быў малебен з акафістам. Паломнікі куплялі малыя іконкі велікамучаніка Дзімітрыя і прыкладвалі іх да вялікай іконы. Святую Літургію ўзначальваў епіскап Бельскі Грыгорый у саслужэнні архімандрыта Гаўрыіла з Дабравешчанскага манастыра ў Супраслі, ігумена Паісія з Варшавы і свяшчэннікаў Варшаўска-Бельскай і Беластоцка-Гданьскай епархій. На святкаванні на аўтобусах прыехалі паломнікі з Варшавы, Беластока і Гайнаўкі. Іншыя прыбылі на машынах і прыйшлі пяшком. Некаторыя прыхаджане прыехалі на трактарах, бо такім транспартам карыстаюцца пастаянна. У час Літургіі царква ізноў запоўнілася, а звонку сабралася яшчэ больш вернікаў, чым ноччу. У час пропаведзі архімандрыт Гаўрыіл спасылаўся на гістарычныя здарэнні, якія закончыліся для жаўнера Дзімітрыя з Салуні мучэннем і смерцю. Паставіў ён маладога Дзімітрыя як прыклад правільнага выхавання дзіцяці. Прасіў бацькоў прыводзіць сваіх дзяцей у царкву і вучыць духоўнаму жыццю дома. Архімандрыт Гаўрыіл перасцерагаў перад еўрапейскай уніфікацыяй і намаганнямі стварэння аднаго хрысціянскага веравызнання. Прасіў трымацца догмаў праваслаўя, за якія загінуў велікамучанік Дзімітрый. Святкаванні закончыліся хрэсным ходам. Епіскап Грыгорый успамінаў аб ганеннях праваслаўных хрысціян. Ганіцелі мелі загад мучыць людзей, якія толькі прызывалі Хрыстовае імя. Уладыка прапанаваў сабраным у Саках наследаваць першых хрысціян і маліцца Ісусавай малітвай.

Намеснік Мужчынскага манастыра ў Саках ігумен Варсанофій гаварыў, што велікамучанік Дзімітрый штодзень дапамагае мясцовым манахам і паслушнікам. Пасля малітваў атрымлівалі яны грашовыя і рэчавыя ахвяраванні. Праваслаўныя вернікі дапамагалі перабудаваць школу на манастырскі будынак з келлямі. З некалькіх залаў збудавана была царква. Летам праводзіўся рамонт мураванай хаты ў Залешанах, якая прыстасоўваецца на дом паломніка. У купленым будынку перабудаваны былі сцены і дах. Манахам памагаюць парафіяне. Прывозяць яны ў манастыр харчаванне і выконваюць некаторыя работы. Падтрымліваюць іх праваслаўныя ахвяравальнікі з Польшчы і іншых краін.

Ігумен Варсанофій паінфармаваў вернікаў аб дапамозе манастырскага заступніка ў Грэцыі. Нядаўна ў Салуні было землетрасенне. Пасля супольных малітваў у цэрквах гэтага горада і хадайніцтва велікамучаніка Дзімітрыя, беды абмінулі горад і ніхто не загінуў.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ля іконы велікамучаніка Дзімітрыя

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Міхал і Ніна Астроўкі

Ostrówka siał zamęt

Доўгая Трасцянка

Міхалу было 25, Ніне 17. Звяла іх вера Ільінная іхных дзядоў. Пражылі разам ужо паўстагоддзя.

— Моцна былі веруючыя нашы дзяды, — кажа Ніна Астроўка. — І дамовіліся нас пажаніць. Вярнуўся Міхал з арміі з артылерыі, зараз і вяселле нам зрабілі. Трох сыноў маем, дачка Тамарка памерла ў 8 месяцаў.

Спадарыню Ніну на ўспаміны збірае, бо ж добры кавалак жыцця пражылі, і добрага, і благога было ў ім з берагамі, а дзядзька Міхал папраўляе акуляры, і аж рвецца пра актыўнае былое распавесці. Мабыць, усе тут у Трасцянцы такія, поўныя энергіі, незалежныя, з думкай пра агульныя справы. Было тут 300 гаспадароў... Успамінаецца Міхалу Астроўку 1973 год, а, гледзячы на яго, успамінаюцца ягоныя папярэднікі, народ рэвалюцыйны, упарты. А як было з тым асяродкам здароўя? Які быў патрэбны ў вёсцы, а цяпер і не, бо людзей замала.

— 17 студзеня 1970 года памерла маё дзіцё. Доктарка дала завялікую дозу „оксітэрацыну". Не было нават звычайных цэвак адводзіць мачу. Жонка пасля таго трапіла ў бальніцу. Месяц пасля дзіцяці паміраў дзядуля. Я пайшоў да яго. На скрыжаванні прысеў, адпачыць, а тут скорая едзе, лекар пытаецца, дзе тэлефон, каб паведаміць цэнтралю, што не даедзе да родаў — снегам дарога завалена. Кажу, дам сані. А лекар: „А што, хочаце, каб я замёрз?!" Пайшоў я па трактар. Чакаў ад сёмай раніцы да сёмай вечара. Урэшце прыехаў трактар, а на трактары родны лекараў бацька. Давезлі мы жанчыну ў шпіталь. Калі б прыехалі дзесяць мінут пасля, сказалі лекары матцы, дзяўчынка ўжо не жыла б. Так нараджалася Івонка Кучэўская... Прыйшла ліквідацыя Грамадскай рады, заставаўся пусты дом. Народ выслаў мяне ў дэлегацыю ў Міністэрства здароўя. „Запрапануй дом пасля рады, хай цэлы прызначаць на асяродак здароўя". Выслухалі, пасля тыдня прыехала камісія з павета і параіла, каб выслаць дэлегацыю да І сакратра ПАРП у Беластоку Здзіслава Куроўскага. Сакратара не было, намеснік не згадзіўся: „Заблізка да Нарвы, там асяродак ёсць". А ў Нарву дарога трэцяй чарговасці адснежвання, зімой засыпаная, таму маё дзіця памерла, скорая не магла даехаць да маці Івонкі! Ну, выслаў нас да дырэктара праўнай арганізацыі. Пераважыў аргумент, што меншая Ласінка мае свой асяродак, а ў нас яго няма, хоць найбольшая вёска ў гміне. І хай альбо даюць нам лекара, або адлучымся да ЗОЗ у Беластоку — туды зімой бліжэй чым у Гайнаўку: навокал праз Бельск 144 кіламетры ў два бакі! Праз два тыдні атрымаў я ліст і перадаў яго народу...

Не дарма называлі Міхала Астроўку „народным трыбунам" — да сёння ў яго мове засталіся словы *народ, патрыятызм*... Некаторыя лічылі, што быў звычайным самазванцам, ён, не вельмі вучаны, іншыя мяркуюць, што калі б меў шанц вучыцца, дык і вялікім чалавекам быў бы!

—... Прадставіў я тое *пісмо* народу. Вёска прыняла яго з задавальненнем. Доктарка з Нарвы здэкларавалася: „Буду прыязджаць на два дні ў тыдзень". Ды вёска хацела поўны штат. Паехаў я зноў у ваяводства, шукаць лекара. З дапамогай доктара Шэляхоўскага знайшоў.

Доктар Эльвіра Морка прыйшла ў Трасцянку ў маі 1973 г. Узяла два пакоі — адзін лекарскі, другі для медсястры. Раней кіраўнік школы ўзяў у былым грамадскім доме чатыры пакоі для настаўніц, пакуль не будзе доктара. Пайшла лекарка прасіць яшчэ іншыя пакоі — на чакальню, пакой для дзяцей, дантыстычны кабінет. Кіраўнік школы адмовіў, запрапанаваў нават, каб лекарскі кабінет падзяліць на чатыры. Пайшоў Астроўка да солтыса, каб ратаваць новы асяродак здароўя, а вёску ад ганьбы — то ж ніякі лекар у Трасцянку не прыедзе, калі даведаюцца, як патрактавалі доктар Морку. Раней зноў быў у міністэрстве, і там здзівіліся, што гміна не можа памагчы ў гэтай справе. Прывялі артыкул 94 з дапаўненнямі да закону аб нарадовых радах з 25 студзеня 1958 г., тэкст апублікаваны ў Дзённіку законаў н-р 47, пазіцыя 277, дзе напісана: „Солтыс склікае вясковы сход на патрабаванне адной пятай часткі выбаршчыкаў пражываючых на тэрыторыі салэцтва". Солтыс склікаў сход, па прапанове Астроўкі. Трасцяніцкія людзі сабраліся. Абмеркавалі, што і асветныя справы важныя, і здароўе таксама. Люд выбраў кватэры для настаўніц, і загадаў, каб тыя пакінулі будынак асяродка здароўя.

— Пасля сходу сталі мы на скрыжаванні ў пяцьдзесят мужыкоў. Пад'ехаў кіраўнік школы (пасля начальнік) на ровары: „Я вас у пракуратуру падам, што вы тут бунт зрабілі!" — „Пане кіраўнік, але закон кажа так і гэтак!" — „Я ніякага закону не ўважаю, а цябе, Астроўка, пасаджу!" Раніцай доктарка атрымала загад, каб явіцца ў міліцыю ў Нарве. Была на сходзе, значыць, у бунт умяшалася. Паехаў я ў асяродак. Спадарыня Морка не магла ехаць да каменданта — у яе было 30 хворых, і пазваніла яму, каб сам да яе прыехаў. Я сядзеў на варце асяродка, ды ніхто не прыехаў. На наступны дзень прыбегла дачка Васіля Петручука: „Памажыце, нашу доктарку арыштавалі, камендант вёў яе праз усю вёску да кіраўніка школы!" Спаткаў я яе ўжо на прыпынку. Казала каменданту: „Я тут да бунту не заклікаю, а людзей лячу". Ключоў ёй да асяродка не далі.

Зноў Астроўка з солтысам Петручуком параіліся, і солтыс рашыў: „Склікаю гмінны сход!" Паказалі каменданту ліст з ваяводскай рады, высланы на адрас Астроўкі.

— Перапрасіў камендант нас, усю грамадскасць, за свае дзеянні, што быў уведзены ў зман. Настаўніцы павінны былі пакінуць асяродак. Ды ключоў не далі. Напісалі мы зноў у Гайнаўку...

Пасля чатырох гадоў гмінныя ўлады рашылі асяродак здароўя ліквідаваць (усё ж дзейнічаў да 2002 г.). Зноў Міхал Астроўка стаў у яго абарону. Традыцыйна ўся вёска стала на ногі. Гэта быў ужо 1980 год. Лексіка была далей Астроўкава, ясная і „народная". У гарачы дыскусіі цяжка часам ужыць дыпламатычныя словы. Улада паскардзілася ў суд, што гэты самазваны „народны трыбун" псуе ёй аўтарытэт, склікае сходы... Зневажае ўладу. Люд апусціў галовы.

На партыйнай экзекутыве (Астроўка быў кандыдатам у ПАРП) крычаць: „Астроўка прабуе праставаць палітыку партыі, хацеў вырасці па-над рашэнні камітэта! Sieje zamęt! Увесь ток судовага разбору «паказаў грамадскую шкоднасць» ягоных дзеянняў" — сцвердзіў сакратар партыі. Трэба было перапрашацца за *podważenie autorytetu*. Улада не хацела перапросін. Пасля шкадавала, што адразу з жыхарам Трасцянкі не пагадзілася, а прыцягнула да гэтага Феміду.

Тым больш цяпер, калі дэмакратыя. Адшумелі страсці. І рэвалюцыйная Трасцянка, здаецца, прыціхла. Хоць на ўспамін людзям крыўда пячэ ў сэрцы.

Міра Лукша

Запіскі з горада на Няве

Юбілейная дэкада

Санкт-Пецярбург — адзін з буйнейшых індустрыяльных, навуковых і культурных цэнтраў Расіі, горад архітэктурных помнікаў і паркаў, горад вялікіх гістарычных падзей, горад герой. Ён таксама частка майго жыцця, бо жыў я ў ім амаль пяць гадоў (1948-1953) будучы студэнтам Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Пазней яшчэ некалькі разоў наведаў я сяброў-пецярбуржцаў. А сёлета, якраз у час святкавання 300-годдзя Санкт-Пецярбурга мне зноў пашчасціла быць у гасцях у Таісіі Фокінай ды ў яе дачкі і зяця Сяргея Гайваронскага разам з беластачанамі Ірэнай і Антонам Семянковічамі. Я нанава з вялікай прыемнасцю адкрываў славутасці паўночнай сталіцы Расіі.

Юбілейная дэкада працягвалася ад 23 мая да 1 чэрвеня. З гэтай нагоды ўсе ўстановы і прадпрыемствы, а нават маленькія кіёскі выглядалі па-святочнаму. Усюды было мноства сцяжкоў, плакатаў, палотнішчаў з надпісамі „300 год Санкт-Пецярбурга". З нагоды юбілею было падрыхтавана мноства мерапрыемстваў, у тым ліку міжнародны карнавал (прыйшло восемсот тысяч удзельнікаў), канцэрт Розенбаўма на Палацавай плошчы (30 тысяч чалавек), ці водная феерыя і лазернае шоу (прыбыло на набяражную Нявы паўтара мільёна гледачоў).

Кульмінацыйным пунктам святкавання юбілею горада была міжнародная сустрэча 43 прэзідэнтаў і прэм'ераў. Гэта першая ў сусветнай гісторыі такая сустрэча ў адным часе і ў адным месцы такой колькасці кіраўнікоў дзяржаў. Адбывалася яна ў асноўным у прыгарадзе Санкт-Пецярбурга — у палацова-паркавым ансамблі ў Стрэльнай.

Мы з вялікім зацікаўленнем аглядалі тэлеперадачы з удзелам прэзідэнтаў і прэм'ераў, але самым цікавым было завяршаючае відовішча ў Пецяргофе сярод помнікаў, славутых фантанаў і сходаў, феерверкаў, а таксама пазалочанага жывога балету з удзелам вядомага італьянскага саліста Лючыяна Павароці. Адна сустрэча лідэраў дзяржаў не ўдалася. Дождж і вецер сарвалі спатканне гасцей з Уладзімірам Пуціным ля знакамітага Меднага ездака. Авіяцыі не ўдалося разагнаць хмар над Піцерам, не было магчымасці стрымаць моцны цыклон з-над Балтыкі. Па гэтай прычыне важная імпрэза была перанесена на борт велізарнага беласнежнага цеплахода „Сярэбраны шэпт" (даўжыня яго 186 метраў, шырыня — 24,8 метра). На барту судна 194 каюты. Быў ён выпісаны з Даніі.

У час юбілейнай дэкады пецярбуржцы карысталіся некаторымі льготамі. Мабільнымі тэлефонамі можна было званіць бясплатна (звычайнымі таксафонамі па горадзе там увесь час можна карыстацца дарма). Ветэраны і пенсіянеры маглі бясплатна наведаць Эрмітаж, астатнія гараджане — за 50% скідкай.

Міхась Хмялеўскі

Палацовы мост

З месячнага боку

Дарагая Домна! Сніцца мне, што я дома; мой дом — шпіталь і манастыр. Жыву там з сям'ёй у адным пакойчыку. Раптам усе жыхары-пацыенты ўзнімаюць радасны вокліч. Пануе прыемны закалот — якраз пад наш дом пад'ехаў аўтобус, а ў ім чатыры пасажары: пан прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі з жонкай і парай дзяцей — дзяўчынкай і сынком. Дзяўчынка гэта Оля, ёй 11 гадоў. У яе на твары сляды ад рака. Усе жыхары нашага дома бягуць прывітаць прэзідэнта, а я з перакорлівасці ці, можа, сціпласці, астаюся ў пакоі. Гутару тут з сяброўкай з ліцэя; ведаю, што яна хварэла ракам лёгкіх, але зараз яна аздаравела і памаладзела. Гутарым, успамінаем... А тут да нашага пакойчыка: „Стук-стук!". Уваходзіць самавітая дэлегацыя: прэзідэнцкая сям'я. Разам — мой чалавек.

— A czy wiesz, Handziu, że jesteśmy rodziną? — кажа пан Аляксандр Кваснеўскі. — Bo tak naprawdę to ja się nazywam Józef Kowalski i pochodzę z Suwałk! (так, як святой памяці мой цесць).

— А-а-а, — запыкалася я, — а чаму вы гэта так доўга хавалі перада мной?

Пасля гутарым, па-сямейнаму, сімпатычна. Усе пацыенты шэпчуцца паміж сабой, усміхаюцца неяк вернападданча. Прачынаюся ў добрым настроі. Ганна

Дарагая Ганна! Ты прачнулася ў добрым настроі, бо так звычайна адчуваеш сябе чалавек пасля цяжкай працы, якую ты выканала паспяхова. У тваім сне відаць, што ты моцна папрацавала над сабой, можа і гэтага не ўсведамляеш. Праца псіхікі працягваецца так доўга, як жыццё чалавека. Зараз закончыўся толькі адзін з этапаў.

Калі чалавек у адносінах да сябе шчыры, тады за кожную добрую „псіхічную" справу атрымоўвае заплату. Хоць нельга іх перакласці на канкрэтныя грошы — духовыя скарбы, на якія мы самі можам у нейкай частцы запрацаваць, маюць намнога большую вартасць. Можна спрачацца, ці „грошы шчасця не даюць". Ведаем адно — добрае ў нас ёсць пропускам да шчасця. Без псіхічнай сілы, унутранай мудрасці і адвагі — цяжка ў жыцці ствараць дабро.

Табе адна з брам да шчасця якраз адчынілася. Чаму я так думаю? У тваім сне важныя лікі, між іншым — чатыры. Чатыры значыць шчасце. Можа невыпадкова шукаем канюшыну з чатырма лісткамі, што мае прынесці нам поспех.

Чатыры — важны сімвал (яшчэ да яго вярнуся). Так ці інакш, дзелім свет на тое, што добрае і што дрэннае, прыгожае і брыдкае, важнае і малаістотнае. Так ацэньваем не толькі месцы, з'явы, але і людзей. У снах існуе падзел на добрае і благое, але мае яно іншае як у рэальным жыцці значэнне. Здавалася б, шпіталь і манастыр — два розныя месцы: у жыцці ў першым лечымся, а ў другім молімся. У цябе гэтыя два месцы ў сне зліваюцца ў адно. Можна гэта лёгка разгадаць. Папраўдзе, абодва дапамагаюць аздаравець: у шпіталі лечым цела, у манастыры — душу. Патоля ад болю — шчасце, на якое чалавек мусіць запрацаваць пакутай. Таксама ў тваім сне: кляштар і шпіталь абазначаюць паварот да здароўя, напэўна, пасля вельмі балючага часу. Нягледзячы на тое, што ў сне не ведаем, чым хварэем, то можна гаварыць пра хваробы шпітальных гасцей: рак дачкі прэзідэнта і тваёй сяброўкі. Гэтыя жахлівыя хваробы ўжо прайшлі, так як закончылася або неўзабаве закончыцца твая псіхічная пакута. Узнагарода за гэта — доступ да псіхічнай моцы, пропуску ў шчасце. Манастыр, таксама ў сне, гэта месца, дзе чалавек набірае моцы. Гэта наша духовая святая прастора.

У тваім сне з'яўляюцца не толькі важныя месцы, але важныя асобы: прэзідэнт з сям'ёй. Гасцей — чацвёра. Звярні ўвагу, што важныя таксама лікі: адзін і два. Быццам бы адзін, але падвойны шпіталь-манастыр, двое дзяцей у прэзідэнта, яго дачка мае адзінаццаць гадоў, а твая сяброўка мела рака лёгкіх, якія складваюцца з дзвюх частак. Варта звярнуць увагу на тое, што ў гэтай сімволіцы няма самастойных элементаў, штось заўсёды збудавана з чагосьці.

Не акрэслена да канца таксама значэнне сонных герояў. Здзіўляешся візітацыі галавы дзяржавы. Замест ісці за ўсімі, ты выбіраеш гутарку з сяброўкай. Мабыць, і ў жыцці ты больш любіш прыватныя кантакты з людзьмі ад афіцыйных. Нягледзячы на гэта, і так у канцы сустракаешся з важнай асобай, а яна з афіцыёза зменіцца ў блізкага чалавека.

Твой сон паказвае, што ў жыцці шмат што можа памяняцца. Для прыкладу: людзі — тыя, якіх успрымаем з дыстанцыяй, раптам могуць стаць блізкімі. Мабыць, ужо ведаеш, або толькі прадчуваеш, што жыццём не кіруюць рацыянальныя прынцыпы. Аказваецца, нават лікі, на якія абапіраецца матэматыка, можна тлумачыць усебакова. Так як у жыцці — адну сітуацыю складвае некалькі элементаў, часам вельмі розных. Пэўна, таму так цяжка нешта адназначна ацаніць. У цябе ёсць ужо спосаб, каб спраўляцца з жыццём поўным непрадбачанага: ты верная сабе, не гонішся за тлумам. Ведаеш, што так лягчэй знайсці час на задуму, на канцэнтрацыю, а таксама на пошук чатырохлістай канюшыны.

Домна (domnason@wp.pl)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Старшыня Віктар Рэент перад сіласамі і будынкам суполкі „Фармпаш"

Трэба рэфармаваць кааператыў

Сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў „Рольмак" з Макаўкі (пісалі мы аб складанасцях у папярэднім нумары) гаспадарыць зараз на дзвюх тысячах гектараў зямлі, якія сёлета ў пераважнай большасці былі абсеяны збожжам. Аднак галоўны даход у кааператыве ад гадоўлі.

— Цяпер многа ўвагі адводзім птушынай і звярынай прадукцыі. Плануем прадаваць у год каля трох тысяч тон мяса з індыкоў, па дванаццаць тысяч — вепручкоў і восем тысяч — кормнікаў. Сельскагаспадарчы кааператыў, гэта ўстарэлы спосаб гаспадарання і трэба рэфармаваць яго, — гаворыць старшыня Віктар Рэент. — Пасля ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз палепшыцца рэнтабельнасць сельскагаспадарчай прадукцыі і ўстабілізуецца прадукцыя мяса і яек.

Буракі ў „Рольмаку" вырошчваліся на 170 гектарах, а кукуруза — на 400 гектарах. Плён збожжа ў кааператыве быў ніжэйшы ад мінулагодняга на 18%. Аднак гэтыя страты будзе кампенсаваць вышэйшая цана збожжа. Прадукцыя зерня кукурузы і цукровых буракоў была большай ад мінулагодняй і цэны на іх таксама лепшыя. Даход з гайнаўскага гандлёвага магазіна, які застаўся ўласнасцю кааператыва лепшы, чым у прошлым годзе. У 2002 годзе пры кааператыве „Рольмак" узнікла суполка з абмежаванай адказнасцю „Фармпаш". Кааператыў „Рольмак" атрымаў у ёй 35% паёў, а апошнія купілі фізічныя асобы. Новая суполка будзе займацца скупкай збожжа ад сялян і перапрацоўкай яго на корм для жывёл (да 3 тысяч тон у месяц). Апошнім часам шырэй адкрыўся ўсходні рынак і „Рольмак" перапрадае туды мясныя прадукты. Нядаўна кааператыў атрымаў прапанову супрацоўніцтва з Беларуссю.

Аляксей Мароз

Папраўка да папраўкі

У 45 н-ры „Нівы" ад 9 лістапада 2003 г. Ян Хіліманюк звярнуў Аляксею Марозу ўвагу, што ў час з'езду Камітэта пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы Віктар Бура, чытаючы пратакол з працы Рэвізійнай камісіі, прадставіў няпраўду. Паводле Яна Хіліманюка ў пратаколе няма прозвішча ні яго, ні рахункавода, быццам яны крыштальна чыстыя.

Пратакол з праверкі Рэвізійнай камісіі ад 24 верасня 2001 года; толькі некаторыя са шматлікіх нядбайнасцей галоўнага рахункавода:

— картатэкі не падлічаныя і не ўведзеныя ў пачатковы баланс;

— для некаторых рахункаў не пералічана сальдавых разлікаў;

— не прадстаўлена для праверкі пераліку коштаў атрымання прыходаў.

Паводле заявы рахункавода, апошнія кошты не ўведзены ў разлік. Да таго ж шмат іншых засцярог Рэвізійнай камісіі.

Наступны пратакол Рэвізійнай камісіі ад 30 мая 2002 года — толькі некаторыя з многіх нядбайнасцей і хібаў:

— у апошніх гадах для наёму выканаўцаў работ у будынку Музея не аб'яўляліся таргі;

— музейныя экспанаты ляжаць у складах без уліку, без апісання, не размеркаваныя, не кансерваваныя.

У час гэтай праверкі і пераправеркі за 2001 год Камісія выявіла недапушчальныя парушэнні палажэнняў Закона аб рахункаводстве ад 29 верасня 1994 г. Тлумачэнне рахункавода на гэты конт не апраўдала перад Камісіяй ягонай рэзкай халатнасці.

Пратакол з праверкі Рэвізійнай камісіі ад 11 верасня 2003 года: Камісія запатрабавала ад рахункавода прадстаўлення бухгалтарскіх дакументаў, але ён іх не паказаў і за подпісам пацвердзіў іх брак.

Каб чытачам „Нівы" лепш уявіць беспарадак, які царыў пры былым старшыні, прывяду той факт, што я ў 2002 годзе неадплатна перадаў Музею звыш дзесятка каштоўных экспанатаў, якіх па сённяшні дзень не ўведзена ва ўлік і не пазначана іх. Ды і іншыя, тканіны, ляжаць у сырых падвалах у мяшках... Ці не смярдзючая гэта справа, спадар Хіліманюк?

Працытую вытрымку з пратакола ад 11 верасня г.г.: „вызваліць з працы тых асоб, якія дапусцілі халатнасці так у парадкаванні экспанатаў, як і ў бухгалтарскім уліку". Чытаючы на з'ездзе гэты пункт, я адкрыта сказаў, што такімі асобамі з'яўляюцца галоўны рахункавод і старшыня; апошні аднаасабова адказны за сукупнасць, за маёмасць Музея і за нагляд за працай падлеглага персаналу.

Я прапаную спадару Яну Хіліманюку, каб усе пратаколы Рэвізійнай камісіі паслаў у адпаведныя органы, якія — мяркую — навядуць парадак у мысленні былога старшыні.

З павагай —

Віктар Бура

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вілы малога і сярэдняга бізнесу

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Дырэктар прымае на працу новага работніка:

— Чаму вас звольнілі з папярэдняй працы?

— Бо ўцёк з жонкай дырэктара.

— Сапраўды? Вы ўжо працуеце для мяне!

* * *

Да дырэктара прыходзіць дзяўчына ў пошуках працы:

— Ці магу паглядзець вашы рэферэнцыі? — пытае дырэктар.

— Так, толькі не тут. Магу іх паказаць у болей сакрэтным месцы.

* * *

Настаўніца загадала вучням напісаць сачыненне на тэму, як яны ўяўляюць працу дырэктара. Усе пішуць — адзін Янка нічога не робіць.

— А ты чаму не пішаш? — пытае настаўніца.

— Чакаю сваёй сакратаркі.

* * *

У кабінет дырэктара, калі той трымае на каленях сакратарку, уваходзіць працаўнік:

— Пан дырэктар, хачу вам паведаміць, што надыходзіць сюды ваша жонка. І, пры нагодзе, падбаўце мне зарплату...

* * *

Дырэктар экзаменуе кандыдата на свайго намесніка:

— Уявіце сабе такую сітуацыю: едзеце на двухмеснай машыне. Спыняе вас тры асобы: ваш загадчык, старэнькая бабулька і прыгожанькая дзяўчына. Каго б вы забралі?

— Сышоў бы з машыны, аддаў бы ключыкі загадчыку з просьбай падвезці бабульку, а сам застаўся б з дзяўчынай.

* * *

— Калі сужонства шчаслівае?

— Калі жонка сляпая, а муж глухі.

Адгаданка

1	2	3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25	26	27

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. змаганне, барацьба, бітва = 24 __ 19 __ 20 __;
2. горад між Магілёвам і Рагачовам = 8 __ 27 __ 5 __ 22 __ 23 __;
3. чалавек з вялікімі вусамі = 2 __ 17 __ 1 __ 25 __ 16 __;
4. яўрэй = 18 __ 13 __ 15 __;
5. абшар, зарослы дрэвамі = 6 __ 7 __ 26 __;
6. нутраны авечы або ялавічны тлушч = 9 __ 3 __ 4 __.
7. шахматная фігура, якой у пачатку па восем у кожнага саперніка = 11 __ 10 __ 12 __ 21 __ 14 __.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 37 нумара

Рукаў, цеста, Сірыя, Чачня, эпіка.

Рашэнне: **Кастрычнік**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Венядыкту Руткоўскаму** з Варшавы.

Прываблівыя пахі

Перад сёлетняй зімой мядзведзь Сандар Жоржавіч у таямніцы шлэпаў то на ўсходнія крэсы над мяжу Уладзімірскага лесу, то на заходнія — Александрыйскага. Прынюхваўся, якія пахі даходзяць ад суседзяў.

— Пераеўся наш запас, трэба дзесьці харчавую ўшчыкнуць. Можа, Нятупінуваўку, а, можа, александрыйцам, — задумваўся ад нейкага часу.

Ад таго прынюхвання Жоржавіч спазніўся на чарговы сход уселяснога кіраўніцтва. Вычэкваючыя на паляне лань Гаўрусіха, вавёрка Кацюша, заяц Генік, барсук Барушчук сядзелі маркотныя. Нават дзяцел Стукач, які сядзеў, як заўсёды, на дубе, асалавеўшы спусціў дзюбу, хоць дасюль, з-за сваіх спецабавязкаў, ежа сама яму ў дзюбу залятала, са спецрацыёнаў.

Урэшце задыханы мядзведзь з’явіўся на паляне. Пысу меў зашчэмленую, а шчокі надзьмутыя.

— Міша, што з вамі? — занепакоілася лань Гаўрусіха.

— Ваша аблічча нейкае, так сказаць, іншае... — здзівілася Кацюша.

Заяц Генік стаў на заднія лапы, перахіліў галаву, а вушы яму натапырыліся.

Сандар Жоржавіч нічога ім не адказаў. Узняў толькі правую лапу ў жэсце „Увага!” і выпусціў з пысы ўсё паветра ў бок прысеўшага ўселяснога кіраўніцтва. Ад феерыі смачнотных пахаў Гаўрусіха самлела. Генік вушамі, а Кацюша кітай замахалі, каб як найбольш іх надыхацца. А Стукач заклекатаў дзюбай так, што грацыёзнае „ам-ам” пранеслася па ўсім жоржавічавым лесе.

Мядзведзь глыбока ўздыхнуў.

— Нёс я да вас паветра з пахамі ад самай александрыйскай мяжы. Хацеў данесці і пахі з уладзімірскага боку, але тады ўсе яны мне памяшаліся б у роце. Ну, і што?

— Ай! — уздыхнула лань.

Рэшта кіраўніцтва глянула на мядзведзя мройліва.

— Калі ў іх такая жратва, як тыя пахі, то няма што азірацца на Нятупіна і на ягоны лес Уладзімірскі! — рашуча выказаўся заяц Генік.

— І мне так штосьці здаецца! — падтакнуў мядзведзь. — Толькі як з імі дагаварыцца?.. Мы ж з імі не вельмі падтрымлівалі адносіны. Нельга жа ж угнявіць Нятупіна, ну, самі ж ведаеце...

— Ну-ну, так... — завярцелася вавёрка.

З дуба азваўся Стукач, што з ім здараецца рэдка:

— А, можа, паразмаўляць з непрыемнымі нам, але ж, усё ж, паходзячымі з нашай лясной браціі, змяёй Ссапіяй, вужом Ззянонам і з гэтым самым... Свіналычом? Мо, папасрэднічаюць?..

— Ну, хай, — пагадзіўся мядзведзь. — Пашлем на перамовы вавёрку ды зайца.

— На-ас?! — у адзін голас здзівіліся тыя.

— Гэта таму, што найбліжэй можаце падысці да іх, па прычыне росту, — прабаваў тлумачыць мядзведзь.

— А той дзік? — успомніла мажнасць Свіналыча вавёрка.

— Ну, станеце перад ім на заднія лапкі.

Такім рашэннем кончылася перадзімовая сустрэча ўселяснога кіраўніцтва. Тым часам вуж, змяя і дзік ужо ведалі, што александрыйскія пахі звабілі мядзведзя і ўсё кіраўніцтва. Вядома было ім і тое, што з пасланнем прыбягуць да іх Кацюша з Генікам.

— Ну, заўсёды дарма нічога няма, — сказала калегам змяя. — Цікава, ці пагодзяцца яны на наша. Не на якіясьці абыштоські, а штосьці такое, што...

МакХолад

Чысты смех

— Няма больш жорсткіх стварэнняў, чым жанчыны! — мой сябра Антымон Зарукаўнік, зразу, прыехаўшы да мяне ў госці, гэтак апавясціў, толькі сеўшы ў мяккі фатэль.

— Цябе што, Антымоне, твая Каруся з хаты прагнала? — падсунуў я яму ўласную шклянку з халоднай ужо гарбатай. Вада ў чайніку не закіпела яшчэ, а, бачу, Антымон ледзь не млее. — Супакойся. Напіся.

— Ты што-о-о? — пакрыўдзіўся госць. — Як твае няма, то нават чаю не зварыш? Сябра — халоднай гарбатай? У арміі і пасля як сябравалі! Колькі чаго, так сказаць, выпілі... Колькі солі пераелі!..

— Антысь, ты што... А і пра кабеты... Ты што... Агата — ласкавая, добрая. Ну, вядома, бываюць...

А наш Антымон, хлябнуўшы гарбаты, крыху адсопся. А міна ў яго злосная, урэдная. Ён такі заўсёды „анты”. Я тлумачыў, што і імя такое мае. Тлумачылі мы ў войску: „Антыманапольны”. Ну, ну, у сэнсе дзяржаўнага манаполю на махорку ды гарэлку. Тады ён быў такі, востры і рашучы ў выказваннях наконт дзяржаўнага манаполю і шкоднасці вырабаў ягоных; ну, не ягоных, але з якіх дзяржава дзярэ грош і жыве...

Забегаў я па кухні, парасчыняў шафкі, халадзільнік. Усё тое, што сарганізаваў, заехала на лаву.

— Ну, і як жывецца табе без твае? — кульнуў чарачку Антымон і, здаецца, яхідна ўсміхнуўся.

— Ну, бачыш... Някепска. Калі есці не хочацца, дык і не ем. Адно Гарэшцы што звару, бо ж сабаку есці даць трэба цёплае, старэнькі ён...

— Гэта не сабака, а сука. А яны ўсе — на адзін капыл. Бабы!

— Та ўжэ ж... — я ўжо ведаў, што Антымону лепш не пярэчыць.

— Ты чуў пра такое? Адна кабета ў Азіі свайго чалавека пару гадоў трымала ў ванай і не выпускала?

— Мабыць, чысціню любіў! — спрабаваў я пажартаваць.

— Яна гэта і сказала паліцыі: „Па тры разы ў дзень прымаў душ”. Палічыла яна гэта псіхічнай анамаліяй, зачыніла мужа ў лазеньцы. Калі ўрэшце яго адчынілі, ляжаў без сілы на падлозе, увесь голы!

Пасядзелі мы хвіліну ў маўчанні, ашарашаныя злачынствам азіяткі. Антымон кульнуў другую чарку, не азіраючыся на мяне.

— Але і я чысціню люблю... — пачаў я.

— Бачу, што парадак у хаце... Ну, то як, вырваўся з-пад апекі свае Агаты?..

— Яна мяне ў лазеньцы не зачыняла! — абурыўся я. — Бывала, і разам там вадзяныя працэдуры прымалі... Ну, не клізмы ж. А пра парадак Агата вельмі дбала. Эх...

— То што, можа табе якая цяпер іншая парадак наводзіць? — прыгледзеўся спачатку на падлогу, а пасля мне ў вочы даследчыцкім вокам Антымон.

— Не, не. Часам толькі мне мой малады сябра, па звычцы, тое-сеё прапыласосіць. Ён такі дзівак, што, калі прыходзіць у госці, альбо старыя здымкі хоча глядзець, альбо бярэцца за парадак.

— Сябра? Малады? — Атымон выцер рот хустачкай. Пасля зноў наліў і паглядзеў на мяне неяк дзіўна. — Ну, Вандал, па табе я такога не спадзяваўся.

— Ты што — і супраць баб, і супраць мужыкоў? Ты нейкі Антыпол, Антымон!

— Я ніякі не Антылоп! — Антымон урэшце засмяяўся.

Вандал Арлянскі

ISSN 0546-1960